Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 1 1933 г. ПЯТНІЦА № 265 (4809) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ

XVII з'езд партыі сустрэць крутым уздымам работы транспарта. І. ЛЫЧОЎ—Шырэй разгарнуць масавую работу КК-РСІ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА—Барацьба за замацаванне рэзультатаў чысткі — важнейшая задача кожнай ячэйкі.

Совецкія пісьменніні РСФСР на прыёме ў старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА.

Герой стратасферы тав. ПРАКОФ'ЕЎ у Менску.

ЗА МЯЖОЙ.

ЛЕЙПЦЫГСКІ ФАРС. Трыбун класавай праўды.

Фашысцкае абліназачанне церліць правал за правалам.

Скліканне германскага рэйхстага.

XVII З'ЕЗД ПАРТЫІ СУСТРЭЦЬ КРУТЫМ УЗДЫМАМ РАБОТЫ ТРАНСПАРТА

XVII з'езд УсеКП(б) паша краіна сустракае магутным працоўным уздымам. Совецкі Саюз у рэкультыце першай пяцігодкі і першага года другой пяцігодкі, пяхільна праводзячы генеральную лінію партыі, выйшаў у рады перадавых індустрыяльных краін.

Атрыманы сусветна-гістарычныя перамогі ў социялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ліквідавана ў асноўным кулацтва як клас. Калгасны лад перамог беспаваротна.

Няма такой галіны народнай гаспадаркі, якая-б не мела гігантскіх поспехаў. Расце і чыгуначны транспарт. Пакінуўшы ззаду даваенны ўзровень, чыгуначны транспарт ужо ў 1932 годзе перавыканаў у чатыры разы заданні першай пяцігодкі. Грузавыя перавозкі за чатыры гады выраслі на 81,3 проц. у той час, як, напрыклад, у ПАЗНІ за 13 год яны выраслі на 78 проц. У СССР асвоена вытворчасць звыш магутных паравозаў, вялікагрузых вагонаў і г. д. Толькі ўчора загадам Наркамшляхпрама СССР уведзен у строй Луганскі гігант паравозабудаўніцтва, якому няма роўнага ў Эўропе. Луганскі гігант па сваёй магутнасці ўступае толькі аднаму амерыканскаму «Болдвін Локомотыў Воркс».

Не гледзячы на вялікія поспехі чыгуначнага транспарта, усё-ж вялізарны рост народнай гаспадаркі апярэдзіў развіццё транспарта і ставіць яго далейшую рэканструкцыю, як адну з важнейшых задач другой пяцігодкі. Поспехі прамысловасці і сельскай гаспадаркі патрабуюць ад транспарта бесперабойнай і выразнай работы, бо **«аслабленне чыгуначнага транспарта, перабоі ў яго рабоце азначаюць з прычыны гэтага аслабленне ўсёй народнай гаспадаркі, аслабленне і падрыў абароназдольнасці краіны».** (З пастановы ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах). І таму партыя аддае зараз выключную ўвагу ўздыму транспарта, ператварэнню яго з вузкага месца ва ўзорны ўчастак социялістычнай гаспадаркі.

Сабатажнікі, класавыя ворагі, перарадженцы супратыўляюцца рэалізацыі пастаноў ЦК і СНК, стараюцца ўсякляк пакасціць і перашкаджаць перабудове транспарта. Палітаддзелы—большэвіцкае вока на чыгунцы, апіраючыся на лепшую перадавую частку чыгуначнікаў, праводзяць вялізарную работу па ачыстцы транспарта ад гэтых элементаў, па ўстанаўленню жалезнай пролетарскай дысцыпліны, па ажыццяўленню гістарычных пастаноў партыі і ўрада. У **Віцебску, Жлобіне, Гомелі, Оршы** палітаддзелы пры дапамозе лепшых ударнікаў выкрылі не мала кулакоў, белагвардзейцаў, зладзеяў, гультаёў і інш., якія шкодзілі, развальвалі вытворчасць. Прадстаўнік ЦК вялікая работа па ачыстцы транспарта ад гэтых элементаў.

Паказальнікі работы чыгункі БССР сведчаць, што перабудова ідзе яўна незадавальняюча. Вось узяць хоць-бы **Віцебскі вузел.** Там хворы паравозаў пры норме к 1[illegible] 26-[illegible] 27,9 проц., а 27 лістапада—28,7. Адчэпак вагонаў за гэтыя два дні было 27. Следаванне паездоў па расціванню ледзь дасягае 50 проц.

Заслугоўвае асаблівай увагі пытанне аб спаранай. Многія дэпо злачынна адносяцца да выканання патрабавання партыі аб строгім правядзенні спаранай. У **Віцебскім** дэпо (начальнік **Ефімаў**) толькі 40 паравозаў маюць пастаянных гадароў. Рэшта абязлічаны. На некаторых паравозах ездзіла ўжо каля 20 машыністаў. Хіба гэта не ёсць сабатаж аздараўлення паравознай гаспадаркі? Або вось **Жлобінскае** паравознае дэпо. У кастрычніку было 117 зрываў спаранага па афіцыяльных зводках. Справе-ж іх безумоўна больш.

[illegible] з **якасцю** рамонта [illegible]заў, так і вагонаў. У [illegible]**скім** паравозным дэпо ў кастрычніку было 66 паўторных рамонтаў. У **Магілеўскім** за гэты-ж месяц было каля 80 адчэпак з-за гарэння букс. Выключна дрэнна з якасцю і ў **Гомельскім** вагонным дэпо. Нават завод імя Ланцуцкага, які дасканала выконвае планы па колькасных паказальніках, сістэматычна выпускае паравозы і вагоны з бракам. Як відаць, большэвіцкай барацьбы за **якасць** работы, за жалезную дысцыпліну на радзе ўчасткаў транспарта яшчэ няма. Партарганізацыі тут не надыйшлі яшчэ ўпчыльную да рэалізацыі цэнтральнай задачы першага года другой пяцігодкі—асваення новай тэхнікі, барацьбы за якасныя паказальнікі.

Падрыхтоўка да зімы будзе вырашаць поспех важнейшых перавозак. Праведзеная палітаддзелам і другім месяц таму назад праверка падрыхтоўкі ўсіх участкаў транспарта да зімы і спецыяльна праведзеныя партыдні па гэтаму пытанню выявілі рад абураючых выпадкаў простай бязрэйнасці чыгуначных чыноўнікаў у падрыхтоўцы да зімы. Прайшло больш месяца. Тэрмін больш чым выстарчальны, каб падцягнуцца і выправіць выяўленыя недахопы. Аднак, паступаючыя сігналы сведчаць, што ў радзе месц становішча засталося бяз змен.

Вось што піша, напрыклад, наш карэспандэнт **Л. Бусін,** з Гомельскага раёна: «Яшчэ 28 студзеня 1933 г. прадстаўнікі дэпо Гомель, абследаваўшы вадакачку станцыі **Прыбор,** запісалі наступны рамонт: 1) паставіць трубу да спускнога катлавана крана; 2) ізаляваць параправод і ўмацаваць катлавую пашпартную таблічку; 3) паставіць пажарны адростак і забяспечыць пажарным рукавом. 23-га кастрычніка гэтага-ж года на вадакачку прыбыў зноў прадстаўнік дэпо і канстатаваў, што рамонт не выканан. У дадатак да ранейшага ён дапісаў: «паставіць ролік і прывод да прадахаваўчых клапанаў». На гэты раз тут-жа быў запісан тэрмін выканання—10 лістапада. Аднак, канчаецца ўжо лістапад, а рамонта не думаюць рабіць. А між тым вадакачка патрабуе неадкладнага рамонта і самога будынка, бо ў фундаманце адваліўся цэмент і стварыліся дзіркі, праз якія ідзе снег у машыннае аддзяленне. Цячэ дах. Сігналізацыя не працуе. Такое-ж прыкладна становішча сеткі водаспабжэння і на станцыі **Рэчыца.** Тут паглынаючая студня перапоўнена вадой, ёсць пагроза, што калі наступяць вялікія маразы, вада замерзне ў калонках. За ўсе гэтыя агіднасці нясуць адказнасць начальнік Гомельскага дэпо **Рэдзькін** і начальнік 28-й дыстанцыі шляху **Швайкоўскі».**

Гэта карэспандэнцыя паказвае найбольш ярка, што канцылярска-бюракратычныя метады работы на транспарце яшчэ жывуць, што рашучай барацьбы за ўзброеную сустрэчу зімы яшчэ няма. Трэба зламаць кансерватызм, які пануе па чыгунцы. Трэба моцна ўдарыць па разважаннях аб тым, што зімой на чыгунцы перабоі законны. Партыя паставіла задачу зрабіць гэту зіму першай зімой, у часе якой транспарт не будзе ведаць перабояў у рабоце. Гэтага трэба дабіцца ва што-б там ні стала.

Масавы рух за арганізаваную дапамогу транспарту падняўся па ўсёй краіне. Калгасныя масы ўключыліся ў спаборніцтва па ўзорную арганізацыю снегабарацьбы. Задача заключаецца зараз у тым, каб на аснове шырока разгорнутай масава-палітычнай работы і социялістычнага спаборніцтва забяспечыць практычную рэалізацыю ўзятых самаабавязацельстваў.

Дапамога тэрытарыяльных партыйных, совецкіх і прафсаюзных арганізацый транспарта да гэтага часу была яўна невыстарчальнай. Толькі зараз адчуваецца паварот у гэтай справе. **Гомельскі** ГК КП(б)Б узяў на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па аказанню дапамогі чыгунцы (адкамандаваць сваёй рабочай сілай і матэрыяламі 10 пуцявых будак і г. д.). З яго ўзяў прыклад **Жлобінскі** РК і інш. Аднак, трэба падкрэсліць, што гэта толькі пачатак паварота, які па вінен быць значна ўзмоцнен і паскоран. Партыя рашуча ўдарыць па гнілой павіцы нейтралітэта тэрытарыяльных арганізацый у адносінах да транспарта. Партыя патрабуе сістэматычнай дзелавой дапамогі ў яго перабудове.

Зусім нецярпімыя адносіны клієнтуры да скарыстання рухомага састава. Трэба значна ўзмацніць барацьбу з антыдзяржаўнымі адносінамі клієнтуры да транспарта, а таксама з затрыманнем вагонаў і па віне чыгуначных разгільдзяяў і проста шкоднікаў.

Рабочыя і калгасныя масы нашай краіны сустрэлі паведамленне аб скліканні XVII з'езда нашай партыі новым магутным уздымам творчага энтузіязма, новымі вытворчымі перамогамі. Задача партыйнай арганізацыі чыгуначнага транспарта ўзначаліць гэты ўздым рабочых чыгуначнікаў. Пад кіраўніцтвам палітаддзелаў, на аснове большэвіцкай рэалізацыі пастаноў ЦК і СНК, шырокага разгортвання соцспаборніцтва, барацьбы за далейшае паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў, узмацнення пролетарскай дысцыпліны забяспечым да XVII з'езда УсеКП(б) рэзкае паляпшэнне работы транспарта БССР.

РЭЙД КК-РСІ І ДРУКУ

КАЛГАСЫ СЛУЧЧЫНЫ Ў ГОНАР XVII ПАРТЗ'ЕЗДА АБАВЯЗАЛІСЯ СКОНЧЫЦЬ ССЫПКУ НАСЕННЯ да 10 снежня

ПАДХАПІЦЬ ГЭТУ ІНІЦЫЯТЫВУ—БАЯВЫ АБАВЯЗАК КОЖНАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

ПЕРШАЕ СЛОВА ПРЫСВЕЧАНА ЦК і тав. СТАЛІНУ

СЛУЦАК. 28. (Па тэлефону).

Адшумелі багатым ураджаем калгасныя палі. З палетак убрана ўсё да аднаго калгаснае зерне. Выкапана з зямлі да адзінай бульбіны.

Густая рунь сваячасова пасеяных азімых цешыць вока калгасніка, абяцаючы на той год яшчэ больш высокі ўраджай.

З узнятым настроем сабраліся сёння старшыні праўленняў і рэвізійных камісій 105 калгасаў на пасяджэнне совета Слуцкай МТС. Радуе вялікая вага працадня, гарантуе сытую, добрую і культурную зіму.

Першае слова прысвечана ленінскаму ЦК УсеКП(б) і тав. **СТАЛІНУ** — арганізатару і кіраўніку барацьбы за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё. Вітаючы падыходзячы XVII з'езд партыі, удзельнікі нарады ўзялі на сябе наступныя абавязацельствы:

у падарунак з'езду да 25 студзеня 1934 г.—дня адкрыцця з'езда—скласці вытворчыя планы па ўсіх калгасах і поўнасцю закончыць рамонт усяго сельска-гаспадарчага інвентара;

да 10 снежня па ўсіх калгасах поўнасцю закончыць ссыпку насення і страхавых фондаў; да 17 снежня закончыць поўнасцю малацьбу; да 20-га—размеркаваць усе калгасныя даходы па працадніях.

Калгасы зоны МТС—ініцыятар усебеларускага паходу за добраякасную жывёлагадоўлю—абавязваюцца да 10 снежня скласці ва ўсіх калгасах кармовыя балансы і поўнасцю перадаць на МТФ і СТФ кармовыя фонды.

Для падрыхтоўкі добрых кадраў, для паспяховага правядзення большэвіцкай вясны другой пяцігодкі нарада абавязалася прапусціць праз 40-дзённыя курсы ўсіх конюхаў, загадчыкаў МТФ, старшынь калгасаў і рахункаводаў; праз 2-месячныя курсы прапусціць усіх брыгадзіраў паляводчых брыгад. У кожным калгасе да 15 снежня арганізаваць дамы соцкультуры і абсталяваць іх усім патрэбным інвентаром.

Для ўзбраення ўсіх калгаснікаў тэхнічнымі ведамі, для яшчэ большага павялічэння заможнасці калгаснай вёскі арганізаваць у зоне дзейнасці МТС 40 агратэхнічных і 55 зоатэхнічных гурткоў.

Нарада абавязалася да 15 снежня поўнасцю выканаць пастанову партыі і ўрада аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі.

Аднадушна ўхвалена прапанова старшыні калгаса «Новае жыццё» тав. **Гурбы Мікіты** аб тым, каб кожны калгас адкарміў кабана ў падарунак таму прадпрыемству Масквы, якое крыцце з лепшымі паказальнікамі да XVII з'езда партыі.

Нарада звярнулася да палітаддзела з просьбай арганізаваць ва ўсіх калгасах і калгасных брыгадах МТФ і СТФ соцспаборніцтва па права ўдзела ў дэлегацыі, якая будзе суправаджаць у Маскву гэты падарунак (50 кабаноў). Права на ўдзел у дэлегацыі атрымліваюць тыя калгасы, якія хутчэй і лепш выканаюць усе гэтыя абавязацельствы.

З канкрэтнай праграмай баявых дзеянняў раз'ехаліся па калгасах удзельнікі нарады для падрыхтоўкі большэвіцкай сустрэчы XVII з'езда большэвікоў.

Іплан.

У ПАЛАСЕ ГЛЫБОКІХ ПРАРЫВАЎ

Аб ссыпцы насенных і страхавых фондаў у Клімавічах думаюць менш за ўсё. Большасць калгасаў даўно ўжо разлічылася з дзяржавай па пастаўках збожжа і бульбы, здала поўнасцю натураплату МТС. Але выканаўшы першую запаведзь, калгасы не пераключыліся яшчэ на ажыццяўленне другой — ссыпку насення.

Раённыя арганізацыі з гэтай справай не спяшаюцца. Запытайцеся ў райвіка, як ідзе ссыпка насення і вам адкажуць: «Вось мы зараз збіраемся пачаць гэтую кампанію».

Толькі зараз! Што-ж дзіўнага, што следуючы прыклад раённых кіраўнікоў, у калгасах таксама праяўляюць поўную абыякавасць да ссыпкі насення. Калгас **«Звязда»,** Дамамерыцкага сельсовета, маючы ўсе магчымасці сваячасова ссыпаць насенфонды, дагэтуль не ссыпаў насення аўса, ячменю, грэчкі і інш. Праўленне калгаса адкладвае ссыпку са дня на дзень.

Такое-ж становішча і ў радзе іншых калгасаў (**«Рабочы»** імя **Літвінава, «Барацьба»).**

У паасобных калгасах насенныя і страхавыя фонды ссыпаюцца з недобраякаснага збожжа, неачышчанага і неадсартаванага (калгас імя **Калініна, «Большэвік Беларусі»** і інш.).

Раённая газета **«КОМУНА»** пе змагаецца за ссыпку насенных і страхавых фондаў. Больш таго, газета труба скрыўляе дырэктывы партыі і ўрада, арыентуючы калгасы на размеркаванне ўраджаю незалежна ад таго, ссыпана, ці не ссыпана насенне.

Так, у нумары ад 22 лістапада, «Комуна» паведамляе аб тым, што калгас **«12-ы Кастрычнік»,** Цімаеўскага сельсовета, не толькі не ссыпаў насенных і страхавых фондаў, але нават не выканаў яшчэ плана паставак збожжа і бульбы. Гэтую заметку «Комуна» дае пад загалоўкам: **«Прыступіць да размеркавання ўраджаю».**

Коментарыі наўрад-ці патрэбны.

Гэта «ўстановачка» газеты асобнымі калгасамі ахвотна кравецца ў ліца. У калгасе «Новы шлях», напрыклад, прыступілі да размеркавання бульбы, не гледзячы на тое, што насенныя і страхавыя фонды яшчэ не ссыпаны.

***

«Звязда» не раз сігналізавала аб глыбокіх прарывах у Клімавіцкім раёне, які ўвесь час ганебна плянцецца ў хвасце па важнейшых сельска-гаспадарчых кампаніях,—асенняй сяўбе, збожжапастаўках і інш.

Клімавіцкія кіруючыя арганізацыі—РК і РВК не зрабілі, як відаць, адпаведных вываадаў з сігналаў «Звязды» і не прынялі мер для ліквідацыі прарываў.

Па-ранейшаму ў раёне панує самасупакоенасць, коснасць, няма канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва калгасамі, няма большэвіцкай барацьбы за ажыццяўленне важнейшых дырэктыў партыі і ўрада. Гэтым толькі можна вытлумачыць адставанне Клімавіцкага раёна і па ссыпцы насенных і страхавых фондаў, бюракратычна бястурботныя адносіны да гэтай кампаніі з боку раённых арганізацый.

М.

Уключыліся ва ўсебеларускі рэйд

Аршанскі раён уключыўся ў рэйд-праверку ссыпкі насенных і страхавых фондаў, абвешчаны ЦКК-РСІ і «Звяздой». Для кіраўніцтва рэйдам створан раённы штаб, у які ўвайшлі прадстаўнікі РКК-РСІ, рэдакцыі раённай газеты «Ленінскі прызыў», палітаддзела МТС, РК ЛКСМБ, райза і палітаддзела соўгаса «Комсамольская праўда».

Для дапамогі сельсоветам і партячэйкам у правядзенні рэйда мабілізаваны 42 чал. партыйнага, комсамольскага і совецкага актыва.

Ход рэйда будзе асвятляцца на старонках раённага і нізавога друку.

Нам. старшыні РКК-РСІ

ДЕЦКІ.

XVII З'ЕЗДУ—БОЛЬШЭВІЦКУЮ СУСТРЭЧУ

ПРАЦОЎНЫЯ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ПА-БАЯВОМУ РЫХТУЮЦЦА ДА З'ЕЗДА ПАРТЫІ

Социялістычны фонд імя тав. Сталіна

Працоўныя **Гомельшчыны** паведамленне аб скліканні XVII з'езда партыі сустрэлі павышэннем тэмпаў і якасці работы. На прадпрыемствах, у соўгасах, калгасах і навучальных установах праведзены масавыя сходы, на якіх рабочыя, калгаснікі і студэнты ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па разгортванню падрыхтоўчай работы да з'езда.

Разгортванне вытворчага паходу імя тав. **Гікало** ў горадзе і ў вёсцы праводзіцца зараз пад лозунгам баявой сустрэчы XVII партз'езда на ўсіх участках работы.

Гарком партыі па-большэвіцку ўзначаліў ініцыятыву працоўных. Бюро таркома 28 лістапада вынесла спецыяльную пастанову аб разгортванні падрыхтоўчай работы да XVII з'езда партыі. **«Апіраючыся на ініцыятыву перадавых ударнікаў раду прадпрыемстваў (завода «Пролетарый», імя Ланцуцкага, Сельмаш і інш.) аб узяцці на сябе канкрэтных абавязацельстваў у сустрэчі з падрыхтоўкай да з'езда, — гаворыцца ў гэтай пастанове,—гарком лічыць неабходным на падставе правядзімага масавага вытворчага паходу імя тав. Гікало разгарнуць шырокую масавую работу па стварэнню, апрача выканання вытворчага плана, социялістычнага фонда імя тав. Сталіна».**

На падставе пастановы бюро распрацавана аперацыйны план правядзення падрыхтоўчай работы да з'езда. Выпрацаваны і апублікаваны ў мясцовай газеце палітычныя лозунгі, пад якімі павінна разгортвацца ўся падрыхтоўчая работа.

Як на прадпрыемствах, так і ў соўгасах і калгасах адчуваецца агульнае ажыўленне, бадзёрасць, павышэнне тэмпаў і якасці работы.

Ф.

4 УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ІМЯ XVII ПАРТЗ'ЕЗДА

ОРША. На прадпрыемствах, соўгасах і калгасах абдываюцца сходы, прысвечаныя пастанове пленума ЦК аб скліканні XVII партз'езда. Рабочыя і ІТР ільнакамбіната ўзялі на сябе самаабавязацельства ў падарунак XVII партз'езду да 1 студзеня асвоіць выпуск новага варштата, **які будзе выпускаць лістоны для часальных машын.** Варштат дасць 8 тыс. рублёў эканоміі ў год.

Рабочыя трактарнага цэха заводу **«Чырвоны барацьбіт»** абавязаліся адрамантаваць трактары так, каб яны працавалі па социялістычных палях, як механізм гадзіннік.

На хлебазаводзе 4 лепшыя ударныя брыгады падалі імя **XVII партз'езда.** Гэтыя брыгады план чацвертага квартала да 25 лістапада ўжо выканалі на 91,1 проц. Брыгады ўзялі абавязацельства канчаткова ліквідаваць брак і даць рабочым хлеб лепшай якасці.

Парт'ячэйка хлебазавода абавязалася сустрэць XVII партз'езд добраналаджанай марксіцка-ленінскай вучобай і поўнай рэалізацыяй праграмы камісіі па чыстцы. (БЕЛТА).

ШЭФСТВА СТАРЫХ РАБОЧЫХ НАД МАЛАДЫМІ

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу ад нашага спец. кар.). На абутковай фабрыцы імя **Лекерта** ва ўсіх цэхах праведзены сходы рабочых па пытанню аб падрыхтоўцы да XVII з'езда.

Вінтавы цэх выклікаў на соцспаборніцтва рантавы. Рабочыя фабрыкі абавязаліся арганізаваць гурткі па тэхвучобе, грамадскі кантроль над якасцю прадукцыі. Старыя рабочыя бяруць шэфства над маладымі. ІТР добраахвотна прымацоўваюцца да гаспадарча-разрахункавых брыгад для аказання дапамогі ім у рабоце.

Зарубежны.

ГЕРОЙ СТРАТАСФЕРЫ т. Г. А. ПРАКОФ'ЕЎ У МЕНСКУ

Учора прыехаў з Масквы камандзір экіпажа першага совецкага стратастата «СССР», які сарабіў рекордны палёт у стратасферу тав. **Георгій Аляксеевіч Пракоф'еў.**

На вакзале тав. **Пракоф'ева** сустракалі прадстаўнікі СНК БССР, цэнтральнага і гарадскога совета Асоавіяхіма, ЦСПСБ і другіх.

А 2-й гадзіне дня тав. **Пракоф'еў** выступіў на сходзе юных піянераў у будынку польскага дзяржаўнага тэатра.

Тысячная дзіцячая аўдыторыя з выключнай цеплатой сустрэла з'яўленне ў зале кіраўніка гераічнага палёта.

Усе дзеці ўстаюць і вітаюць яго.

— Большэвіку стратасферы,—наша піянерскае ўра,—падхапляе ўся зала.

Тав. **Пракоф'еў** у захапляючай форме проста і падрабязна расказаў дзецям, як канструюцца, будуюцца стратастат. Ён гаварыў аб добрай якасці совецкай кабіны, у якой адчуваеш сябе як дома, аб дасканалай якасці совецкай абалонкі, аб добрых совецкіх прыладах, дазволіўшых зрабіць усе неабходныя навуковыя доследы на вышыні, аб якой да палёта ніхто не мог нават марыць.

«...Калі,—як гаворыць **Сюлі Прюдом,** — смеласць лётніка вызначаецца паніжэннем рэнці ў барометры, то ніколі мы яшчэ не адзначалі такога гераізма як 27 мая 1931 года. У гэты дзень **Пікар і Кінфер** падняліся на вышыню 15.871 метр. Іх ртутныя барометры паказвалі даўленне 76 мм.»,—так пісалі буржуазныя газеты ў 1931 г.

30 верасня 1933 г. пры пад'ёме на стратастаце «СССР» трох совецкіх лётнікаў барометр паказаў даўленне 49,7 мм. Гэта адпавядае вышыні 19.300 метраў па прыладах. Такой вышыні яшчэ ніхто не дасягаў.

Стратастат «СССР» горда ўзняўся ў вышыню, не, ён прарваўся ў вышыню праз густы туман капіталістычнай хлусні і антысовецкіх пасцёпаў, або проста замоўчвання ласкавенняў совецкай навукі і тэхнікі. Узняўся і асляпляючым пражэктарам праўды асвятліў вялізарныя вышыні совецкай пяцігодкі.

Невыпадкова і знамянальна, што вышэй усіх людзей зальцелі людзі на совецкім стратастаце, зробленым на нашых заводах, нашымі інжынерна-тэхнічнымі работнікамі і работымі. І яшчэ характэрна, што ні ў самым стратастаце ў прыладах няма ні аднаго грама заграніччных матэрыялаў.

Гэта рэзультат небывалых дасягненняў совецкай навукі і тэхнікі, шыню праз густы туман капіталістычнай хлусні і антысовецкіх пасцёпаў, або проста замоўчвання ласкавенняў совецкай навукі і тэхнікі. Узняўся і асляпляючым пражэктарам праўды асвятліў вялізарныя вышыні совецкай пяцігодкі.

Невыпадкова і знамянальна, што вышэй усіх людзей зальцелі людзі на совецкім стратастаце, зробленым на нашых заводах, нашымі інжынерна-тэхнічнымі работнікамі і работымі. І яшчэ характэрна, што ні ў самым стратастаце ў прыладах няма ні аднаго грама заграніччных матэрыялаў.

Гэта рэзультат небывалых дасягненняў совецкай навукі і тэхнікі, неабвержанага доказа, што рухаць уперад навуку можа толькі социялізм.

Мы павінны быць гатовы да бутучага нападу імперыялістаў на Совецкі Саюз. Мы павінны вычарпальна вывучыць важнейшы ўчастак арэны будучых войнаў — стратасферу, каб месць магчымасць адбіць гэты напад.

Але самае важнае ў справе вывучэння і асваення стратасферы, гэта вялізарная навуковая каштоўнасць тых тайнаў, раскрыццё якіх з ростам совецкай навукі і тэхнікі набліжаецца з кожным днём.

Нашы стратастаты надзвычай прыблізілі той час, калі мы будзем сапраўды ўладаць паветраным акіянам, калі зможам выкарыстаць для мэт хуткага паветранага транспарта ўсю тоўшчу паветранага акіяна, аж да яго самых верхніх пластоў.

Незвычайная аўдыторыя выслухала даклад тав. Пракоф'ева з вялікай увагай. Піянеры закідалі яго цікавымі пытаннямі, на якія тав. Пракоф'еў даў адказы.

Учора ўвечары тав. **Пракоф'еў** выступіў на комсамольскім маладзёжным злёце абароны і актыве асоавіяхімаўцаў.

М. КІН.

Т. ПРАКОФ'ЕЎ—ПРАЦОЎНЫМ БССР

ШЧЫРА РАД АД СВАЙГО ІМЯ І АД ТВАРУ ЎСЯГО КАЛЕКТЫВА РАБОЧЫХ, ІНЖЫНЕРАЎ І ВУЧОНЫХ, СТВАРЫЎШЫХ СТРАТАСТАТ «СССР», А ТАКСАМА АД УСЯГО ЭКІПАЖА ВІТАЦЬ РАБОЧЫХ, КАЛГАСНІКАЎ І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Г. Пракоф'еў

КРАІНА РЫХТУЕЦЦА ДА XVII З'ЕЗДА

МАСКВА, 29 лістапада (БЕЛТА).

Новыя весткі паступаюць з усіх канцоў Совецкага Саюза аб падрыхтоўцы да XVII з'езда партыі.

Паравозны аддзел «Красного Сормова» выканаў 29-га лістапада месячную праграму, даўшы 12 паравозаў.

Датэрмінова выканала 11-месячны план Трохгорная мануфактура (Масква).

Сталявары Магнітагорска, якія абавязаліся максімальна скарыстаць магутнасць сваіх мартэнаў, па-большэвіцку выкананваюць пастаўленую перад сабою задачу. 27-га лістапада мартэнаўскі цэх Магнітагорскага металургічнага камбіната ўпершыню за ўвесь час свайго існавання даў 1000 тон сталі.

Рабочы завода імя Карла Маркса (Ленінград) пачынаюць перадз'ездаўскія справаздачы кожнага комуніста, комсамольца і беспартыйнага ўдарніка.

Асоавіяхім і комсамол Масквы ўзялі на сябе абавязацельства падрыхтаваць да з'езда партыі 50 тыс. «варашылаўскіх стралкоў».

Рабочыя нафтаперагоннага завода імя Пятакова (Баку) абавязаліся да 12 снежня закончыць гадавую праграму.

Прэзідыум ЦК вугальшчыкаў вынес пастанову, якою ставіць перад Усесаюзнай злётам шахцёраў-ударнікаў баявую задачу—узначаліць ініцыятыву перадавых шахт і ліній па Донбасе ў падарунак XVII партз'езду не менш 1 млн. тон вугалю звыш плана.

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Барацьба за замацаванне рэзультатаў чысткі — важнейшая задача кожнай парт'ячэйкі

НА МЕНСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ ІГНАРУЮЦЦА ПРАПАНОВЫ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ

Культпроп „кваліфікуецца" на машыніста

Бясспрэчна, чыстка партыі ўнесла ажыўленне ў работу партыйнай арганізацыі менскай электрастанцыі. Колькасць ударнікаў пасля чысткі павялічылася з 44,4 да 63,8 проц. агульнага ліку рабочых. Арганізавана шэфства старых рабочых над маладымі для дапамогі ў аўладанні тэхнікай.

Аднак партыйная арганізацыя яшчэ не перабудавала па-сапраўднаму работы ў адпаведнасці з указаннямі камісіі па чыстцы і не забяспечыла штодзённага выканання прамфінплана. План па вытворчасці электраэнергіі сістэматычна не выконваецца. **За май, напрыклад, заданне было выканана на 91,8 проц., за чэрвень—96,9, ліпень — 87,6, жнівень — 93,4, верасень — 92,8 кастрычнік — 94,9, лістапад — 93,5 проц.** У лістападзе было 135 гадзін выключэння асобных фідэраў (правадоў). Электрастанцыя недадала прамысловасці і іншым спажыўцам 73,4 тысячы кілават гадзін, або 2,7 проц. плана.

Асноўнымі прычынамі недавыканання плана трыкутнік лічыць недахоп апалу і гранцыю яго якасці. Між тым, у большасці недахоп апалу ёсць рэзультат несвалачэвай яго падвозкі транспартам самой электрастанцыі. Камісія па чыстцы ў сваіх вывадах абавязала парткалектыў электрастанцыі і гаспадарчае кіраўніцтва палепшыць рамонт і арганізацыю работы транспарта з такім разлікам, каб бесперабойна забяспечыць станцыю апалам. На сённяшні дзень гэтага не зроблена. Вывады камісіі не прапрацоўваліся і не адбіты ў планах работы як парткалектыва, фабкома, так і кіраўніцтва станцыі. Да самага апошняга часу ў парткалектыве не было і саміх вываду. Яны знаходзіліся, па заяве сакратара парткалектыва тав. **Камінскага**, недзе ў грамадскага інструктара ЦК.

З уключэннем станцыі ў вытворчы ўказ імя тав. Кірава работа некалькі палепшылася. За пятую пяцідзённку лістапада прамфінплан быў выкананы на 105,2 проц., чаго за ўвесь час пасля чысткі не было ў работе станцыі.

Гэты факт лішні раз пацвярджае, што прамфінплан электрастанцыі можа не толькі выконваць, але і перавыконваць, трэба толькі мабілізаваць усіх комуністаў і беспартыйных рабочых на сапраўды ўдарную большэвіцкай тэмпы работы. Але гэтай мабілізацыі з боку парткалектыва няма.

Нельга абмінуць і факта частай змены сакратароў парткалектыва. Пасля чысткі, г. зн. з чэрвеня, іх змянілася 7 (Шчушак, Табачнік, Шэйман, Кофман, Коўнар, зноў Шэйман і, урэшце Камінскі). У гэтай сакратарокай «свістапляцы» безумоўна хаваюцца прычыны нездавальняючай работы сакратара, слабай парэдыцыплініны і нездавальняючай дастаноўкі партвучобы.

На станцыі былі выпадкі праяўлення антысемітызма. У транспартным цэху рабочы **Жыўліцкі** ацэньваў работу рабочага-яўрэя так: «Жыд і жыдоўская работа». Гэты ан тысеміцкі выпадак, праўда, сустрэў належны адпор з боку грамадскасці. Жыўліцкі знят з работы і выключан з саюза. Аднак парткалектыў і фабком з гэтага выпадка не зрабілі адпаведных вываду, не разгарнулі належнай работы па інтэрнацыянальнаму выхаванню. У рэзультаце, майстар **Базаразўскі** сваім дзром вучням дае мянюшкі, выходзячы з іх нацыянальнасці: яўрэю — «жрабі», беларусу — «поп», паляку — «кебіце». І ўсё гэта праходзіць без рэагавання.

Партдыцыплыну можна характарызаваць хоць-бы такім фактам. На 25 лістапада быў прызначан партыйны ход, аб месцы і часе якога было свачасова паведамлена на ўсіх цэхах. Сход, аднак, не адбыўся, а прычыны явкі большасці членаў і кандыдатаў партыі.

Партвучобай з усіх 64 комуністаў ахоплена толькі 35 чал. Як працуюць школы і гурткі, ні сакратар партбюро т. Камінецкі, ні культпроп т. **Саннікаў** не ведаюць. Ніякага ўлікі наведвання заняткаў культпроп не вядзе. Саннікаў замест наладжвання партвучобы паралыў перакваліфікаваця на чамочніка машыніста і зараз толькі і робіць, што цэлымі днямі прасядзвае ў машынным аддзяленні. Агітмас партколектыва тав. Новіцкі таксама бяздзейнічае.

З пераведзенымі ў кандыдаты і спачуваючымі явкай партыйна-выхаваўчай работы не праводзіцца. Яны прадастаўлены самі сабе. Беспартыйныя рабочыя ў партвучобу не ўцягваюцца. Старшыня фабкома т. **Кацнельсон** зусім не ведае, колькі беспартыйных рабочых учыт нута ў партвучобу і дзе хто з іх зай маецца.

Да апошняга часу ніякага кіраўніцтва з боку парткалектыва работай цэхавых парт'ячэек не было. Толькі гэтымі днямі было разгледжана пытанне на бюро парткалектыва аб размеркаванні партнагрузак паміж членамі бюро цэх'ячэек. Уведзены змяненні партарганізатары, агітматы і інфарматары. Але з вылучанымі таварышамі да сённяшняга дня не праведзена ні адной нарады. Вылучаныя таварышы не ведаюць, што ім канкрэтна рабіць.

Камісія па чыстцы абавязала парткалектыў забяспечыць сістэматычнае правядзенне вытворчых нарад па брыгадах, цэхах і ў цэлым станцыі.

На практыцы гэтыя ўказанні камісіі не ажыццяўляюцца.

Вытворчыя цэхавыя нарады не склікаліся зусім. Сакратар цэхавой парт'ячэйкі т. **Шэйман** намячае іх правесці «у бліжэйшыя дні». Праўда, у апошні час былі праведзены дзве агульна-заводскія нарады. На нарадах было ўнесена рад канкрэтных рацыяналізатарскіх прапаноў рабочымі. У прыватнасці, цех лагерэнік т. **Шыб** і рабочы т. **Гаўрылюк** унеслі прапанову аб выкарыстанні адпрацаванай пары для падсушкі торфа. Вытворчая нарада ўхвалила гэту прапанову, але да яе ажыццяўлення не прыступлена і па сённяшні дзень.

Гаспадарчага разрахунка па цэхах, як і раней, няма. Зараз бюро парткалектыва даручыла члену бюро т. **Шэйману** праверыць гэту справу ў асобных цэхах і далажыць на бюро. Такая пастаноўка пытання сама за сябе гаворыць, што парткалектыў справай гаспадарчага разрахунка займаецца па-казённаму, нібы адбывае нейкую павіннасць.

Факты рэацтва, на якія ў сваіх вывадах указала камісія па чыстцы, не знішчаны і па сённяшнім дню. Зусім нядаўна моў месца выпадак, калі рабочы **Пазнанскі** за работу па рамонту катла, якую можна было выканаць за дзве гадзіны, патрабаваў 80 руб.

Усе прыведзеныя факты гавораць, што вывады камісіі не сталі для парткалектыва праграмай штодзённай работы і мабілізацыі рабочых на барацьбу за большэвіцкае выкананне прамфінплана.

РАБЦЭВІЧ.

Сканцэнтраваць увагу на адстаючых участках

Асноўны паказальнік замацавання рэзультатаў чысткі — гэта ступень выканання прамфінплана прадпрыемствам, работай якога кіруе парт'арганізацыя. Калі ўзяць менскую шпейную фабрыку **«Кастрычнік»**, то яна сваіх тэмпаў, якіх дабілася ў часе падрыхтоўкі і працэсе чысткі, зараз не адае. **Дзесяцімесячны прамфінплан яна выканала на 102,8 проц.** У лістападзе, праўда, ёсць зніжэнне, але яно тлумачыцца не палярызацыяй работы фабрыкі, а вымушанымі прастоямі з-за вялікіх перабояў у падачы электраэнергіі. За месяц прастоі па гэтай прычыне складалі 15 тыс. рабочых гадзін. Калі-б гэтыя гадзіны фабрыка працавала, то выкананне прамфінплана павялічылася-б больш чым на 10 проц. Аднак, не гледзячы на вымушаныя прастоі, фабрыка ўсё-ж лістападаўскую праграму выканала на 96 проц.

Палепшылася і якасць продукцыі. **Калі да чысткі брак даходзіў да 0,7 проц. замест планавых 0,5 проц, то зараз ён даведзен да 0,4 проц.** Асабліва вызначаецца добрай якасцю продукцыі першы агрэгат. Ён амаль не ведае брака. За выпуск добраякаснай продукцыі гэты агрэгат атрымаў ад Наркамлёгпрама СССР премію — 7 тысяч рублёў.

Поспехі выканання вытворчай праграмы ў значнай ступені тлумачацца ажыўленнем работы нізавых партыйных звенняў у зменах, брыгадах. Колькасць партгруп пасля чысткі павялічылася. Раней было 28, зараз — 32. Склад парторгаў на палову абноўлен.

Праверком у сваіх прапановах даў катэгарычную дырэктыву ўмацаваць 2-гі агрэгат партыйнымі сіламі. І трэба сказаць, што парткалектыў фабрыкі гэту дырэктыву выканаў. Калі раней у двух зменах агрэгата было 22 комуністы, то зараз 30.

Сакратар ячэйкі першай змены гэтага агрэгата тав. **Фрыд** — лепшая ўдарніца. Сакратаром яна вылучана пасля чысткі. Узяўшыся энергічна за работу, яна дапамозе з боку бюро парткома, яна правільна арганізавала ў змене партыйна-масавую работу і гэтым самым забяспечыла ліквідацыю прарыва ў выкананні прамфінплана.

Такім чынам, адно з асноўных указанняў камісіі па чыстцы аб унутрыфабрычнай перастаноўцы партыйных сіл з мэтай умацавання асобных партвенняў парткалектывам рэалізавана. Сушакойваецца на гэтым, зразумела, нельга. Работа зменных парт'ячэек і брыгадных партгруп павінна стаць у цэнтры ўвагі бюро парткома.

Як на адзін з момантаў рэалізацыі дырэктыў камісіі, неабходна ўказаць на вылучэнне работніц ад варштата на тэхнічную і кіруючую работу. Радавая работніца т. **Давідовіч**, як лепшая, добра кваліфікаваная ўдарніца, вылучана на пасаду зменнага майстра. Работніца т. **Гарфан** вылучана загадчыкам культмасавага сектара фабкома, работніца т. **Гоментэйн** — культпропам фабрычнага камітэта комсамола. Усе гэтыя вылучэнні ніадрэнна спраўляюцца з даручанай ім работай.

Вось станоўчая работа партарганізацыі фабрыкі па замацаванню рэзультатаў чысткі. Але побач з дасягненнямі ёсць буйныя прабелы і недахопы. Да гэтых недахопаў у першую чаргу трэба аднесці партыйную вучобу.

Калі ўзяць нават фармальны бок справы — ахоп партвучобай комуністаў, то і тут становішча нездавальняючае: ахоп вучобай складае толькі 85 проц. Але было-б яшчэ, як гаворыць, паўбяды, калі-б усе яны наведвалі заняткі ў школах і гуртках. У сапраўднасці-ж мы маем зусім іншы малюнак. Самая вялікая яўка на заняткі складае не больш 75 проц. запісаных. Аднак, такія «шчаслівыя» дні бываюць вельмі рэдка. У большасці на заняткі прыходзіць 40-45 проц. слухачоў.

Падрабязна аб становішчы партвучобы на фабрыцы «Звязда» ўжо пісала. Тут мы толькі адзначым, што на гэтым участку работы рэзультаты чысткі замацоўваюцца вельмі слаба.

Амаль такое-ж становішча і з замацаваннем рэзультатаў чысткі ў галіне партыйнай дысцыпліны. Калі перад чысткай і ў часе яе наведванне партыйных сходаў злачна палепшылася, ліквідавалася запазычанасць па ўплаце членскіх узносаў, то пасля чысткі амаль ва ўсіх зменных ячэйках адчуваецца некаторае аслабленне партыйнай дысцыпліны. Гэта можна прасачыць і па наведванні комуністамі партыйных сходаў і па запазычанасці ўплаты партузносаў. На персанальнай праверцы былі выяўлены комуністы з запазычанасцю па ўплаце партузносаў ад 4 да 10 месяцаў. Камісія ў сваіх вывадах указала парткалектыву на недапушчальнасць такога з'явішча і прапанавала ліквідаваць гэта, як шляхам прыняцця рашучых мер да злосных неплацельшчыкаў, так і шляхам выхаваўчай работы сярод найбольш адстаючых у партыйных адносінах кандыдатаў партыі.

Але парткам і партыйныя ячэйкі аб гэтай прапанове камісіі на заўтра-ж пасля абвяшчэння вываду забылі. Уплата членскіх узносаў паранейшаму была прадастаўлена самацёку. Гэта асабліва ярка пацвярджаецца фактамі, выяўленымі на чыстцы комуністаў, якія не прайшлі праверку па розных прычынах разам з усёй арганізацыяй. Праходзілі праверку 19 чалавек і амаль палова з іх маюць запазычанасць па ўплаце членскіх узносаў ад 4 да 12 месяцаў.

Як на адну з прычын такой вялікай запазычанасці неабходна ўказаць на наведванне сакратарамі ячэек многіх сваіх комуністаў не толькі дасканала, але нават у гвар. Вельмі характэрны з гэтага боку факт быў выяўлен на чыстцы «хвастоў». Комуніст тав. **Цэльнер** на пытанне камісіі, ці ведае ён свайго сакратара ячэйкі, адказаў: «Не ведаю». Тое самае заявіў і сакратар ячэйкі тав. **Кірэйр: «я толькі сёння даведаўся, што тав. Цэльнер — комуніст і з'яўляецца членам ячэйкі, якой я кірую, як сакратар».** Можна сабе ўявіць, як пастаўлена ў гэтай ячэйцы выхаваўчая работа сярод комуністаў, не гаворачы ўжо аб беспартыйных.

У вялікім шарыце апынулася пры гарадская гаспадарка фабрыкі Калі канчалі веснавую сяўбу, трыкутнік каапгаса рапартаваў, што **увосемь ураджай бульбы павінен даць 1.200 тон, а накапалі толькі 500 тон.** Здарылася гэта таму, што сяўба праведзена была нядобраякасна, а трыкутнік каапгаса прыкрыў сваю дранную работу «очковтирательством». Трыкутнік фабрыкі, не ўваходзячы глыбока ў работу каапгаса, прапітаваў гэта «очковтирательство». І толькі зараз, калі каапгас апынуўся ў вельмі сур'ёзным становішчы, усхамянуўся і пачаў прасіць дапамогі з боку гарадскіх арганізацый.

Усе гэтыя адмоўныя факты гавораць аб тым, што партыйная арганізацыя фабрыкі поўнай перабудовы сваёй работы на аснове указанняў праверкома яшчэ не дабілася. Не гледзячы на здавальняючае становішча з выкананнем прамфінплана на асобных участках фабрыкі, партмасавая работа як след не арганізавана. На гэтых участках парткалектыў павінен сканцэнтраваць зараз сваю ўвагу.

Р. ФРАЛОЎ.

СОВЕЦКІЯ ПІСЬМЕННІКІ РСФСР НА ПРЫЁМЕ У ТАВ. М. ГАЛАДЗЕДА

У дзень прыезда 29 лістапада, т. т. **Вл. Бахмецьеў, Бруно Ясенскі, Вп. Лідін, Н. Огнёў, П. Маркіш, С. Вашэнцоў, С. Бройдэ, С. Леўман,** разбіўшыся на дзве брыгады, былі на оходзе менскага партактыва, на злёце ўдарнікаў абароны і праслухалі адзін акт «Лутэнія Анегіна» ў пастаноўцы Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Далёкіяя маскоўскіх пісьменнікаў прысутнічала таксама на адкрыцці Дома мас така.

Учора а 12-й гадзіне пісьменнікі былі прынятыя старшынёй Совета Народных Камісараў БССР тав. **М. М. Гападзедам.** На прыёме апроч гасцей прысутнічалі: старшыня ЦКК — парком т. **Лычоў**, начальнік палітвіраўніцтва НКЗ тав. **Ратнек**, нарком асветы тав. Чарнушэвіч, нарком аховы здароўя тав. **Сурта**, упаўнаважаны народнага камісарыята за межныя справы тав. **Ільнскі**, старшыня арткамітэта ССПБ т. М. Клімковіч, беларускія і яўрэйскія совецкія пісьменнікі: **Андрэй Алексен дровіч, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Міхась Лынькоў, Міхась Чарот, Платон Гелевич, З. Аксельрод, Кульбак,** і **Харык, Л. Кецовіч,** прадстаўнікі рэдакцый цэнтральных газет БССР.

Тав. **Галадзед** у кароткіх рысах азнаёміў маскоўскіх таварышоў з перспектывамі далейшага гаспадарча-культурнага роста нашай рэспублікі і даводі падрабязна спынуўся на пытаннях літаратурнага жыцця совецкай Беларусі, на бліжэйшых задачах, якія стаяць перед нашымі совецкімі пісьменнікамі. Тав. Галадзед звярнуў асаблівую ўвагу пісьменнікаў на неабходнасць стварэння высакаякаснай дзіячай літаратуры, якая прадстаўлена яшчэ вельмі слаба і ў якой адчуваецца вялікая патрэба з боку нашага падрастаючага пакалення.

У ходзе гутаркі тав. Галадзед канстатаваў таксама значнае адставанне нашага крытычнага фронта і заклікаў да больш інтэнсіўнай дзейнасці нашай крытыкі, якая павінна сапраўды дапамагаць ідэйна-мастацкаму росту пісьменніцкіх кадраў.

Наркамасветы тав. **Чэрнушэвіч,** адказваючы на пытаннеі запытанні тасцей, паведаміў аб дасягненнях БССР на ўчастку культурнага будаўніцтва; ён паведаміў аб 100-процантнай ліквідацыі непісьменнасці ў нашай краіне, аб рабоце тэатраў, кінаарганізацый, нарадмоў і іншых культ-асветных устаноў у БССР.

Гутарка дэлегацыі арткамітэта Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР і РСФСР са старшынёй Совета Народных Камісараў БССР прайшла пад знакам умацавання цеснай, творчай сувязі паміж двума брацкімі атрадамі літаратуры Совецкага Саюза.

Л.

ЗА МЕСЯЦ НІЯКІХ ЗМЕН

Яшчэ месяц таму назад пад кіраўніцтвам палітаддзела АРШАНСКАГА раёна на вагонна-рамонтным заводзе імя МЯСНІКОВА быў праведзен адзіны партыйны дзень, прысвечаны падрыхтоўцы да зімы. Партдзень быў добра падрыхтаваны. Актыўны ўдзел прымалі не толькі комуністы, але і беспартыйныя рабочыя-ўдарнікі.

Завод мае ўжо горкі вопыт мінулых год, калі непадрыхтаванасць да зімы, асабліва парасілавай гаспадаркі, моцна адбівалася на выкананні вытворчай праграмы ў зімовыя месяцы. Вось чаму рабочыя брыгады, у якіх прымала ўдзел 55 комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных рабочых, унеслі на партдзень больш сотні канкрэтных прапаноў па найлепшай падрыхтоўцы да зімы. На основе пастаноў партсходаў і прапаноў рабочых, начальнік завода тав. ДЗІЧКОЎСКІ выдаў загад з указаннем адказных асоб і тэрмінаў выканання.

Прайшоў месяц. Карысна праверыць, як-же выконваюцца прапановы, як завод падрыхтаваўся да зімы? Гэтым і занялісь ячэйкі на адзіным партдні 20 лістапада.

Усе тэрміны прайшлі. Зіма наступіла, а завод як быў, так і застаўся непадрыхтаваным да зімніх умоў работы. Засталіся невыкананымі і пераважная частка рабочых прапаноў.

Па пасажырскаму цэху, дзе лепшыя ўдарныя брыгады па-большэвіцку змагаюцца за выпуск у тэрмін сніх саставаў — гонару завода — паравое ацяпленне не праверэна, дахі цякуць, вокны не зашклены, лечы і дымаходы не спраўлены, пад логі ў выбоінах. Цэх не забяспечан пераноснымі лампамі і штэпселямі.

Па дрэвазапрацоўчым цэху такое-ж становішча, як і ў пасажырскім: ацяпленне не дзейнічае, вокны не заскліёны, дах цячэ. Не лепш у кавальскім, малярным, нікеліровачным і механічным цэхах. Нідзе да зімы не падрыхтаваны. Усюды холадна, па цэхах гуляе вецер.

Аднак, горш за ўсё з падрыхтоўкай ПАРАСІЛАВАЙ ГАСПАДАРКІ. Ужо цяпер механічны, дрэвазапрацоўчы і кавальскі цэхі прастойваюць гадзінамі амаль кожны дзень з-за адсутнасці пары. Вугалем і дровамі катлы не забяспечаны: перабіваюцца з аднадзённым запасам. Амаль зусім спынена падача пары ў ацяпленне. ВЫКАНАННЕ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ ПАСТАЎЛЕНА ПАД ПАГРОЗУ.

Аб чым гэта гаворыць? Перш за ўсё аб тым, што кіраўніцтва завода несур'ёзна падыйшло да такога пытання, як падрыхтоўка да зімы. На працягу месяца начальнік рамонтнага цэха БЛІНОЎ, на якім ляжала галоўная частка работ па падрыхтоўцы да зімы, проста сабатаваў гэту работу.

Бліноў вядомы ўжо сваім сабатажам устаноўкі імпартнага варштата «Рапід», спасыланнямі на адсутнасць патрэбных матэрыялаў, рабочай сілы, адцягваў работы па падрыхтоўцы цэхаў і завода ў цэлым да зімы. Ён проста лічыў, што «не ўсякія прапановы рабочых карысны» і з гэтай сцэнкай падыходзіў да вельмі важных і неабходных работ.

Сабатаж праводзіўся і ў адносінах парасілавай гаспадаркі. Вось характэрны прыклад: машыністы і качагары паравых машын ужо даўно патрабавалі ўстанавіць вентылятар пад кацёл № 872, што павінна значна павялічыць эфектыўнасць катла. Тэхнічна ўсё распрацавана. Ужо некалькі месяцаў назад выкананы катлаван і набыт вентылятар. Але як дайшло да БЛІНОВА, устаноўка вентылятара стала адцягвацца з месяца ў месяц. У сярэдзіне кастрычніка пачулі адказ Блінова: «Няма цэмента на фундамант». Прыбыў цэмент. У канцы кастрычніка новае патрабаванне: «Няма цэглы». У сярэдзіне лістапада: «Няма рабочых класці фундамант». І толькі 19 лістапада, калі быў выдан загад аб знятні з работы і аддачы лінейнаму суду сабатажніка Блінова, знайшлося ўсё, для ўстаноўкі вентылятара.

Аднак, ці адзін толькі Бліноў вінават у зрыве падрыхтоўкі завода да зімы? Сабатажу не толькі інжынер Бліноў. Не ў меншай меры сабатаж быў і з боку ГАСПАДАРЧА-МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ЧАСТКІ завода, на чале якой стаяў ГУЛЬКЕВІЧ. Работнікі гэтай часткі нічога не зрабілі па забеспячэнні завода палівам, шкпом і іншымі матэрыяламі.

Рабочыя брыгады ў рэйдавай праверцы становішча работ па падрыхтоўцы да зімы яшчэ ў пачатку лістапада сігналізавалі аб зрыве гэтых работ і толькі фармальна-бюракратычныя адносіны да ўказанняў рабочых далі магчымасць сабатажнікам праводзіць свае шкодную справу.

Папітаддзел прыўчае партарганізацыю працаваць канкрэтна і ў сувязі з шырокімі масамі рабочых. Ён накіроўвае яе на шлях бязпашчаснай барацьбы з сабатажам пастаноў партыі і ўрада аб чыгуначным транспарце. Парткалектыў завода імя МЯСНІКОВА, следуючы ўказанням палітаддзела, павінен з большэвіцкай рашучасцю ачысціць завод ад сабатажнікаў. Упушчаны час у падрыхтоўцы завода да зімы трэба навярстаць. Без гэтага завод не справіцца з задачамі, якія ён узяў на сябе ў паходзе імя тав. ГІКАЛО.

К. ВЕРАМЕЙЧЫК.

І. ЛЫЧОЎ

ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ КК-РСІ

Наша партыя, кіруючыся ўказаннямі т. т. Леніна і Сталіна, не раз адзначала, што важнейшай задачай і абавязковай умовай паспяховай работы органаў КК-РСІ з'яўляецца арганізацыя шырокіх працоўных мас для ўдзела ў кіраўніцтве дзяржавай і кантролі над дзейнасцю яе апарата.

Шырокі актыў працоўных, згуртаваны вакол секцый РСІ з'яўляецца адным з важнейшых загароў умацавання пролетарскай дыктатуры, паляпшэння і спрашчэння дзяржапарата.

КК-РСІ, апіраючыся на ўзрослую актыўнасць рабочых, калгаснікаў і працоўных мас, праводзяць вялікую работу на важнейшых участках соцыялістычнага будаўніцтва.

На жаль, у нашым друку, асабліва ў раённым, вельмі слаба асвятляецца работа секцый КК-РСІ, а між тым на месцах накоплен вялікі вопыт аперацыйна-масавай работы.

Можна прывесці рад прыкладаў, што там, дзе групы добра арганізаваны і забяспечаны канкрэтным кіраўніцтвам, яны здолелі выявіць недахопы ў рабоце, выкрыць вылазкі класавага ворага, паказаць узоры барацьбы за ажыццяўленне лозунга т. **Сталіна** — зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Так, напрыклад, кантрольны пост РСІ ў калгасе імя Булзённага (Чырвоная Слабада) выявіў, што выбраная бульба была накінута без аховы і толькі пасля ўмяшчання пост а бульба была ўбрана.

Пост РСІ на транспарце (Рэчыцкі раён) выявіў рад прастояў вагонаў і выпраўную загрузку 2-х вагонаў пад экспарт завода імя Томскага і 1 вагона пад бульбу для Ленінграда.

Секцыя РСІ Сапокоўскага сельсавета, Ельскага раёна, выявіла ў калгасе «Ульянаўск» (на 20-Х) невыкананне збожжаздаставак на 300 пудоў, дзьнасемя 595 кгр., а таксама факты нелгаспадарчасці пры ўборцы. Зжнае на 19 коп жыта, пры малацьбе ў снопах заставалася кала 25 проц. ільнасемя. Секцыя пастанавіла аб гэтым пытанне перад КК-РСІ, якая правяла выязное пасяджанне прэзідыума КК у самім калгасе «Ульянаўск», зняла з работы старшыню калгаса і прыняла рад канкрэтных мерапрыемстваў па задаруўленню калгаса.

Група садзейнасці пры калгасе «Совецкая Беларусь», Багуцкага сельсовета, праверыла становішча работы калгаса, выявіла цэлы рад блочынстваў — замест уборкі 135 га сенажаці ўбрана 31 га, не скарыстоўваецца с.-г. інвентар, цягавая сіла, варварскія адносіны брыгадзіра Маньковскага да каня і г. д.

КК-РСІ свачасова рэагавала на гэтыя факты, зняла з работы і выключыла з партыі старшыню калгаса, прымацавала члена прэзідыума тав. Герасімёнак да калгаса на час уборкі і ў рэзультаце ўборка была забяспечана.

Факты добрай работы КК-РСІ з масавымі звеннямі РСІ ёсць у Слуцкім, Рэчыцкім, Бабруйскім, Чырвонаармейскім і інш. раёнах.

Але ці ўсе мясцовыя КК-РСІ працуюць пры шырокім удзеле працоўных мас? Безумоўна не. Аб гэтым з усёй выразнасцю паказаў не радавы артыкул «Праўды» — «Перавторым кожную КК-РСІ ў мільнае вока партыі». «Праўда» расказала аб дзейнасці Станаўлянскай КК-РСІ. Гэты раён, у адрозненне ад многіх адтародных раёнаў ЦЧВ, ужо «пеншкі год адстае па ўсіх асноўных народна-гаспадарчых паказальніках — невыкананне загатовак, невыкананне плана зяблёва — раён занесен на чорную дошку! г. д. А якое становішча ў нас у Беларусі? Мы маем паасобныя раёны, дзе КК-РСІ працуюць не лепш Станаўлянскай. Гэтыя раёны да гэтага часу адстаюць у выкананні важнейшых палітыка-гаспадарчых кампаній (збожжаздача дзяржаве, выкананне прамфінплана, палышэнне якасці прадукцыі і г. д.); гэта тлумачыцца ў значнай меры тым, што не ўсе КК-РСІ здолелі мабілізаваць актыў вакол гэтай работы.

Возьмем к прыкладу Талачынскі раён. Раён знаходзіцца ў ганебным прарыве. План па загатоўцы ільну на 20-XI выкананы на 18,9 проц., па бульбазагатоўках на 20-XI выкананы на 69,5 проц., па зяблеўі—на 58,7 проц. і г. д. У радзе калгасаў — «Сцяг працы», Волкаўскага сельсавета, па прычыне засмечанасці кулакамі лён апоен, збожжа-бульбазагатоўкі зрываюцца. Такіх фактаў кулацкага сабатажа, злашчэнства і зрыва загатовак па Волкаўскаму сельсовету шмат.

А як рэагуе на гэтыя ганебныя з'явы секцыя РСІ Волкаўскага сельсавета? А як кіруе ланай секцыяй Талачынская КК-РСІ?

Прыведзеныя факты засмечанасці калгасаў, зрыва загатовак і г. д. даюць просты адказ: дрэнна працуе секцыя РСІ, дрэнна ёю кіруюць.

Секцыя РСІ пры Волкаўскім сельсавеце не здолела мабілізаваць актыў на рашучую барацьбу з кулацкім сабатажам, а групы садзейнасці РСІ пры калгасах адсутнічаюць. Гэта яркі прыклад адарванасці Талачынскай КК-РСІ ад сваіх секцый.

Лёзненская КК-РСІ кіруе актывам выключна вялікімі рэзалюцыямі: «палепшыць работу» і г. д., а на справе-ж актывам не кіруе. Узяты па раёну з 24 сельсоветаў створаны секцыі РСІ толькі пры 3-х сельсоветах. Работа «пёкай кавалеры» ў гэтым раёне зусім адсутнічае.

Адсутнасць работы з актывам работнікі КК-РСІ тлумачаць тым, што РК КП(б)Б прымацаваў іх да паасобных сельсоветаў і калгасаў. Відавочна таварышы не зразумелі або не хочуць зразумець таго, што сваё знаходжанне ў калгасах, соўгасах і сельсоветах трэба было скарыстаць іменна для работы з актывам. У рэзультаце адсутнасці кантроля з боку шырокіх працоўных мас, апартуністычная бяздзейнасці шмат-ных КК-РСІ, мы маем у Лёзненскім ёй практычнай рабоце шырокіх працоўных маю рабочых, калгаснікаў. Гэтыя КК-РСІ забылі, што сотні, тысячы рабочых, калгаснікаў, усхрываючы бацячкі бюракратызма, цягаліны, вулацкага сабатажа, скажэнне класавай лініі, праходзяць вучобу і практыку работы ў групах садзейнасці РСІ. Яны пад кіраўніцтвам партый ў гэтай барацьбе выхоўваюцца, праходзяць школу кіраўніцтва дзяржавай.

Як адну з новых форм масавай работы ЦКК-РСІ БССР правяла вяр бёўку добраахвотнікаў у актыў РСІ з калгаснікаў-ударнікаў. 610 лепшых калгаснікаў-ударнікаў завербаваны ў актыў РСІ, і ЦКК-РСІ трымае з імі самую цесную сувязь. Гэта забяспечыла нам рад сігналаў па пытаннях сяўбы, уборкі, абмалота, збожжаздачы дзяржаве і г. д.

На гэтых сігналах нашых актывістаў ЦКК былі прыняты неадкладныя меры па апашчанню нелахопаў. Гэты вопыт непасрэднай сувязі з асобнымі калгаснікамі-актывістамі трэба пашырыць усім РККРСІ.

Палітаддзелы МТС, соўгасаў павінны аказаць вялікую дапамогу КК у справе ўцягвання і выхавання новага актыва з лепшых ударнікаў-калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, выкоўваючы з іх актыўных барацьбітоў за выкананне гаспадарча-палітычных задач.

Уся работа з актывам павінна быць пабудавана так, каб забяспечыцца выкананне гаспадарча-палітычных задач. Дабіцца поўнага выкання ўсіх відаў загатовак, спазчасовай і поўнай сеялкі насенных і страхавых фондаў, арсартавання, пратручэння і захавання насення — вось задачы канкрэтнай работы. Поўнасцю і свачасова адрамантаваць трактарныя паркі МТС і соўгасаў і ўсіх сельска-гаспадарчых машын.

Забяспечыць другую вясну другой цяжкімі ўкрыцямі, сытым кормам і спраўнай зброяй.

Поўнасцю забяспечыць жывёлу кормамі, цёплым памяшканнем і захаванне ўсяго маяткнка.

Пераадолець зімовыя месяцы ў месяцы вучобы калгаснікаў і калгасніц за палепшэнне якасці работы і ўскладнене «кваліфікацыі брыгадзіраў, трактарыстаў, конюхаў і т. д., за ўзнаўленне ўраджайнасці соцыялістычных палёў.

Усяляць калгаснікаў і калгасніц на барацьбу за культурнае жыццё, за добрую хату-чытальню, за высокае прасоўвание кніг і газет у вёску, за чыстаму і паралак у доме калгасніка, за дабрабыт калгаснай вёскі — дарогі, студні, сады. Асабліву ўвагу неабходна аддаць пытанню размеркавання даходаў у калгасах, разгарнуць вакол размеркавання даходаў масава-палітычную работу.

Павысіць рэвалюцыйную пільнасць, расспрэіць усе махінацыі разбітага, але яшчэ недабітага кулацтва, **зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.** Вось задачы, вакол якіх павінна разгорнуцца масавая работа КК-РСІ.

Работу кожнай КК-РСІ мы будзем расцэньваць па тым, наколькі яны паспяхова ўмацоўваюць сувязь з масамі і ўмела мабілізуюць свой актыў на выкананне тарговых задач социялістычнага будаўніцтва.

***

«Праўда» зусім правільна звярнула ўвагу КК-РСІ на вялізарную ролю і значэнне работы бюро скаргаў, як масавага органа кантроля:

«Вялізарнае значэнне бюро скаргаў — гаворыць т. Сталін,— заключаецца ў тым, што яны з'яўляюцца адным з сур'ёзных продкаў правядзення ў жыццё завета Леніна аб барацьбе за палепшэнне апарата».

Асобныя КК-РСІ і асабліва Лёзненскае бюро скаргаў праяўляюць фармальна-бюракратычныя адносіны да ўдзелу рабочых і калгаснікаў. На скаргу арэй Жук аб палажэнні на яе штрафа старшынёй Лёзненскай страхкасы бюро скаргаў пастанавіла: «ляць пярэду т. Жук падаць заяву ў Галоўсоцстрах».

Гэта ў Лёзненскай КК-РСІ называецца «рэагаваць на скаргі працоўных». За такія «праўды» мы часам жалезнай мятлой выганяць заядлых бюракратаў з лёзненскага бюро скаргаў.

Не лепш стаіць справа ў Оршы. Зат. бюро скаргаў т. Розенблат увесь час знаходзіўся ў вёсцы, выконваючы заданні РК КП(б)Б. Намесніка на свае месца не павінуў. У рэзультаце чаго адносіны заяў і заметак ляжаць непрыпраўнымі тыднямі месяцамі. Рабочых засядацеляў бюро скаргаў ёсць толькі 7 чал., якія сваю дзейнасць абмяжоўваюць наведваннем пасяджанняў і нерэгулярна.

Адсутнасць большэвіцкай праверкі выканання дырэктыў партыі і ўрада разам з масамі прывяла ў асобных выпадках да няправільнага выключэння з калгасаў сераднякоў і бяднякоў, а скаргі аб няправільным іх выключэнні доўга ляжаць неразгледжанымі.

У Лагойскім раёне ляжаць неразгледжанымі 163 скаргі. Ніякага актыва пры КК-РСІ няма.

Такія факты могуць мець месца толькі таму, што асобныя прэзідыумы РККК не выконваюць пастановы ЦКК УсеКП(б), у якой сказана, што

«умацаваць кіраўніцтва бюро скаргаў з боку прэзідыума КК, пры гэтым асабліву ўвагу падбору работнікаў і р... за ўсё — аз. бюро скаргаў, ... выдзяленні выключэнняў з пар... аўтаратычных таварышоў да прэзідыума КК-РСІ, па-большэвіцку арганізаваць работу па скаргах».

Трэба зрабіць рашучы бок большага кампетэнтнага матыўнага кіраўніцтва дыума КК-РСІ работай таў. Неабходна патрабаваць ад адказных работ... ро скаргаў за работу са скаргамі работу з актывам, бо актыў — гэта тыя мноства вочы і мноства рукі, якія дапамагаюць бюро скаргаў. Масавасць і аперацыйнасць — вось галоўнае, што

МЫЛЬНЫЯ ПУЗЫРЫ і САКРЭТЫ ФРАЙМАНА

27 лістапада рэдакцыяй «Звязда» была склікана нарада прадстаўнікоў мылаварнай прамысловасці. У парадку дня стаяла адно пытанне: **выкананне вытворчай праграмы дзяржаўнымі мылаварнымі заводамі і прамысловымі арцелямі Белкрамбытсаюза.**

Роўна ў 10 гадзін раніцы на нараду прышлі прадстаўнікі Белкаапсаюза, Белпрамбытсаюза.

Рэктам у памяшканні прамсектара «Звязды» вырасла высокая постаць прадстаўніка Наркамснаба **Касцевіча.**

— Аб чым я павінен дакладваць?

— Скажыце, як працуе мылаварны завод «Казімі», які вам падпарадкаван? Не забудзьцеся расказаць, што вашым Наркаматам зроблена для забеспячэння сыравінай дзяржаўнага завода «Чырвоны хімік» і прадарцеляй?

Пачыналася роўная, гладкая прамова **Касцевіча.** Што слова, то цыркуляр, а кожны цыркуляр—гэта мыльны пузыр.

— Завод «Казімі» пачаў працаваць. Да гэтага часу стаяў, не было сыравіны. Заданне на чацверты квартал бездоўна будзе не выканана. 60 % адкідаў маргарынавага завода нам патрэбна было перадаць дзяржаўнай прамысловасці для лішэння цены ў чанах. Мылаварному заводу сыравіны няма.

— Значыць, па вашаму перспектыў для далейшай работы завода ніякіх няма?

— Няма. Не бачыў я гэтых перспектыў для далейшай работы завода **«Чырвоны хімік»** і прамысловых арцеляй. Паколькі няма сыравіны, мая думка, што патрэбна саматужныя прадпрыемствы за мыць. Тым больш, што ў канцы 1934 года ў Гомелі будзе пабудаваны новы мылаварны завод, які будзе выпускаць **20 тон мыла ў год.**

— А як-жа прыпер?—пытае дырэктар завода «Чырвоны хімік» Фрайман—Сыравіну вы нам дасцё?

— Ні адной тоны,—адказвае Касцевіч,—наогул, мы гэтай сыравіны не будзем займацца. Мы наркомат і не можам займацца угрызлізацыяй адкідаў вытворчасці.

Работнік гандлёвага аддзела Белкаапсаюза Карыцкі ў сваёй прамове заявіў:

— У нашым распараджэнні ёсць завод, які знаходзіцца ў Менску. Як ён працуе, дакладна сказаць не магу. Непасрэдна гэтай справай у нас займаўся **Каждан.** Ды і ён, па праўдзе кажучы, аб рабоце завода не ведае, бо ніколі там не быў. Я думаю, што за мяне тут скажа дырэктар гэтага завода **Фрайман.**

І Фрайман прыводзіць лічбы ганебнай работы свайго завода.

Апрачасова ён выдумваў прычыны для свайго апраўдання.

— Мы ўвесь час працавалі на мясцовых відах сыравіны. Апроч кальцынаванай і каусьцічнай соды мы нічога не мелі. Тлушчаў мы ад Наркамснаба не атрымлівалі. Адсюль і задання дзесяці месяцаў намі выканана толькі **на 28 проц.**

Сацыялістычная прамысловасць дасягнула вялізарных поспехаў у справе роста прадукцыі, паляпшэння якасці, асваення новых вышынь тэхнікі толькі на аснове шырокага абмена вопытам работы брыгад, цехаў, заводаў і фабрык. Але для Фраймана гэта мабыць таксама з'яўляецца сакрэтам.

Зусім інакш за гэту справу гляджаць стары рабочы-мылавар **Рапапорт.** Ім зроблен вопыт варкі гаспадарчага мыла з адыходаў мясакамбінатаў (баранні і цялячыя кішкі). Вопыт удаўся. Мыла атрымалася не прыгожае. Зараз тав. **Рапапорт** працуе над удасканаленнем свайго вынаходства. І вось ён прышоў у рэдакцыю для таго, каб перадаць вопыт работы ўсім прадпрыемствам мылаварнай прамысловасці.

— Дзесяць арцеляй выпрацоўваюць мыла з сыравіны, мною прапанаванай. Аршанская арцель выконвае сваё вытворчае заданне таму, што яна мае сыравіну. А дагэтуль адкіды мясакамбінатаў ішлі на свалку. І мной была зададумана ідэя утылізаваць іх і даць краіне сотні тон **35-ці** процантнага мыла. Я гэтага дабіўся...

Пасля таго, каб быў вынайдзен спосаб варкі мыла з кішак, Белпрамбытсаюз паслаў тав. Рапапорта па мясакамбінаты БССР і Заходняй вобласці для заключэння дагавораў на пастаўку сыравіны мылаварным арцелям. Мясакамбінаты на гэту справу адклікнуліся.

І калі-б усе работнікі мылаварнай прамысловасці займаліся пытаннямі ўлаўлівання адкідаў гарбарнай прамысловасці і мясакамбінатаў, заводы і арцелі маглі-б поўнасцю забяспечыць мылам узрастаючыя культурныя запатрабаванні працоўнага насельніцтва БССР. Гэтага няма. Дзяржаўныя заводы чакаюць пакуль Наркамснаб дасць ім сыравіну, а самі нічога не робяць для таго, каб знайсці яе. На заводах совецкай Беларусі знаходзяць сыравіну для мылаварнай прамысловасці ленінградскія, маскоўскія заводы.

— Колькі дагавораў было вамі заключана на пастаўку адкідаў з гарбарнай прамысловасці,—было задана пытанне работніку Белкаапсаюза **Карыцкаму.**

— Не ведаю!

Не дастаткова займаліся гэтай справай і арцелі і сістэмы Белпрамбытсаюза. Больш таго, яны не скарысталі ўсіх тлушчаў 60-ці салатопак. **Салатопкі за дзесяць месяцаў далі толькі 15 тон тлушчаў.**

Работнікі Белпрамбытсаюза, супакоіўшыся на поспехах, якіх да бўся тав. **Рапапорт,** чакалі, што другі від сыравіны прыплыве да іх сам, у парадку, так сказаць, самацёка. Адсюль і вынік: адзінаццацімесячнае заданне арцелямі выканана толькі на **39 проц.**

На нарадзе было паказана, што мылаварныя заводы і арцелі маюць усе магчымасці для поўнага выканання плана па выпуску высакаякаснага мыла. Па разважаннях аб закрыцці мылаварных арцеляй і заводаў, як і па засакрэчванню вопыта скарыстання адкідаў патрэбна са ўсёй рашучасцю біць. Мылаварная прамысловасць Совецкай Беларусі можа і павінна працаваць так, як гэтага патрабуюць інтарэсы краіны.

А. Манькоў.

ПАРАД БАЯВОЙ ТЭХНІКІ

Гірлянды электрычных лампачак абвілі вялізарную арку трыбуны. Трыбуна і арка здалёк нагадваюць сабой баявы лінкор, на мачце якога ў праменнях электрычнага святла адлюстроўваюцца транспаранты з надпісамі: «Фініш ваенізаванай эстафеты».

5 гадзін і 30 мінут. На пляц Волі прыбываюць першыя этапы эстафеты паказа баявой тэхнікі.

Ударнікі баявой падрыхтоўкі часцей менскага гарнізона — пётнікі, танкісты, артылерысты, кавалерысты, самакатчыкі, сапёры эстафетай дастаўляюць злёту рапарты аб сваіх поспехах у баявой і фізычнай падрыхтоўцы.

Дэвізамі эстафеты, як і дэвізамі вучобы, баявой падрыхтоўкі і наогул соцыялістычнага будаўніцтва з'яўляюцца лозунгі нашай партыі: «КОМСАМОЛІЯ! НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ Ў БАЯВОЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СПАТКАЕМ XVII З'ЕЗД НАШАЙ ПАРТЫІ!», «КОМСАМОЛ! МАЦУЙ АБАРОНУ СССР», «КАПІТАН КРАІНЫ СОВЕТАЎ Т. СТАЛІН ВЯДЗЕ НАС АД ПЕРАМОГІ ДА ПЕРАМОГІ», «НЯХАЙ ЖЫВЕ ТАВ. СТАЛІН — ЛЕПШЫ ЎДАРНІК АБАРОННАЙ РАБОТЫ».

Яшчэ не паспеў змоўкнуць апошні шосты ўдар гарадскога гадзінніка, як па пляцу пракаціпася гучнае грамавое «УРА». У змрочнае пістападаўскае неба ўрэзаліся сотні ракет. Узарваліся, рассыпаліся шматмільённымі пламяючымі кропкамі і папяцелі ўніз рознакаляровымі агнявымі кветкамі, асвятляючы сваім фасфарытным святлом непераможную веліч навейшай баявой тэхнікі, якую падарыла першая пяцігодка нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Пад нязмоўчныя раскаты гучнага «ура», бадзёрыя гукі «Інтэрнацыянала» і баявы сапют артылерыстаў, кулямётчыкаў, на трыбуну ўзыходзяць член Рэвваенсавета СССР і начальнік Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма Саюза тав. ЭЙДЗМАН, члены бюро ЦК ЛКСМБ, старшыня ЦС АСО Беларусі тав. ДУБІНА, член бюро ЦК УсеЛКСМ тав. ХАРЧАНКА, начальнік аддзела авіяцыі т. ГЕЛЬФЕР і інш.

Кароткая прывітальная прамова сакратара ЦК ЛКСМБ т. **ГЕРЦОВІЧА** і парад паказа пачаўся.

У баявым парадку па трыбуны праходзяць чырвоныя пагранічнікі, праносяцца на чацвёрках кулямётныя тачанкі, кавалерысты, самакатчыкі, матарызаваная пяхота, праскакваюць, пазвяваючы вусеніцамі, вяргтлявыя танкеткі і ў завяршэнне — магутныя хутказходныя танкі.

Гэта—толькі парад паказа баявой тэхнікі. На парад выйшла толькі маленькая частка ўсяго таго, што дала краіне Совецкай і нашай слаўнай Чырвонай арміі першая пяцігодка, але і па гэтай частцы можна меркаваць аб магутнасці нашай слаўнай Чырвонай арміі, аб баявой тэхніцы, якая ператварыла РСЧА у непераможную і магутную сілу, якую вораг не застане знянацку, якая нікому не дазволіць безпакарана таптаць капіталістыя палі і працягваць крывавыя кілці да нашых фабрык і заводаў.

Грозныя і магутныя будуць яе кароткія і сакрушальныя ўдары. Гэта павінны ўцяміць усе ворагі СССР, соцыялістычнай бацькаўшчыны сусветнага пролетарыята.

Дэлегацыя Баўманскага раёна Масквы на злёце.

ЗАКРЫЎСЯ ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ УДАРНІКАЎ АБАРОНЧАЙ РАБОТЫ

На трыбуне злёта герой стратасферы тав. Пракоф'еў

30 лістапада зранку працавалі секцыі злёта: фізкультурная, стралковая, санітарная, авіяцыйная і па рабоце сярод дзяцей.

На вячэрнім пасяджэнні адбываліся спрэчкі па дакладу т. т. **Дубіны і Гольдмана.** У спрэчках выступілі т. т. **Давідовіч** (Орша), **Абезгауз** (з фабрыкі «Спяг індустрыялізацыі»), **Пятроў** (завод імя Варашылава), **Мурат** (начальнік Беларускай авіяшколы), **Малей** (загадчык ваеннага сектара «Комсамольской Правды») і іншыя.

Начальнік аддзела авіяцыі Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма тав. **Гельфер,** падкрэсліўшы ў сваёй прамове недавальняючую пастаноўку авіяработы ў сістэме Асоавіяхіма Беларусі, паставіў перад злётам і комсамолам Беларусі рад канкрэтных задач у разгортванні і наладжванні гэтай справы.

На злёце выступілі з прамовамі начальнік стратастата «СССР» тав. **ПРАКОФ'ЕЎ** і старшыня ОНК БССР тав. **ГАЛАДЗЕД.**

З'яўленне героя стратасферы тав. **Пракоф'ева** сустракаецца бурнымі апладысментамі і крыкамі «ура». Усе прысутныя ўстаюць і наладжваюць тав. **Пракоф'еву** бурную авацыю. Тав. Пракоф'еў выбіраецца ганаровым дэлегатам злёта і членам прэзідыума.

З вялікім захапленнем і напружанай увагай злёт заслухоўвае прамову т. Пракоф'ева. Паступова, этап за этапам, ў кароткіх рысах, тав. Пракоф'еў знаёміць злёт з гісторыяй развіцця авіяцыі і асабліва з гісторыяй палёта ў стратасферу. Знаёміць з задачамі, якія сталі перад палётам у стратасферу стратастата «СССР», канструкцыямі самаго стратастата і прыладаў, перадае свае ўражанні і перажыванні пры палёце.

З напружанай увагай злёт выслухаў прывітальную прамову старшыні ОНК Беларусі тав. **Галадзеда.** Тав. Галадзед, спатканы бурнымі апладысментамі, опынуўся падрабязна на задачах абароназдольнасці краіны і ролі ў гэтым як злёта, так і ўсяго комсамола і працоўнай моладзі Беларусі. Прамова тав. Галадзеда не раз перарывалася бурнымі апладысментамі.

Пад бурныя апладысменты злёт прыняў пастанову паслаць прывітальныя тэлеграмы т. т. **Сталіну, Косареву, Варашылаву, Гікало і Галадзеду** і падшэфным пагранічнікам.

Злёт пачаў арганізаваць збор сродкаў на пабудову самалёта імя старшыні Цэнтральнага совета Асоавіяхіма, члена Рэвваенсовета Саюза тав. **Эйдэмана.** Тут-жа на злёце распачаўся збор і ў некалькі мінут паступіла каля тысячы рублёў. Дэлегацыі паасобных раёнаў заключылі паміж сабой сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзенне збора сродкаў.

Дэлегацыяй Баўманскага раёна (Масква), якая прыняла шэфства над абарончай работай на заводзе імя Варашылава (Менск), на злёце былі ўручаны значкі варашылаўскіх стралкоў дырэктару завода тав. Шэлкову і т. т. Разоўскаму і Марусевічу, якія ў прысутнасці дэлегацыі заўсёды нормы на варашылаўскіх стралкоў.

На злёце былі прэміяваны лепшыя ўдарнікі абарончай работы тав. **Пашкова** (райААХ Орша) — гадзіннікам і 100 руб. прэміума, інструктар-снайпер фабрыкі «Праца» (Гомель) тав. **Рабіновіч** — касцюмам і 100 руб., інструктар каманды атрада ПВА (Віцебск) тав. **Драбава** — касцюмам і 100 руб., інструктар Беларускай авіяшколы тав. **Засыпкін** — касцюмам і 100 руб.

Злёт прыняў адозву аб **разгортванні масавай абарончай работы і ператварэнні ўсіх фабрык і заводаў, калгасаў і соўгасаў у цытадэлі абароны СССР.**

У 11 гадз. вечара сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Герцовіч першы ўсебеларускі комсамольска - маладзёжны злёт ударнікаў абарончай работы аб вясёлай закрытым.

ДЗЕННІК ЗЛЁТА ЎДАРНІКАЎ АБАРОНЫ

На вячэрнім пасяджэнні 29 лістапада працягваліся спрэчкі па дакладах т. т. **Дубіны і Гольдмана.** У спрэчках, спатканых бурнымі апладысментамі, выступілі старшыня ЦК НК РСІ т. **Лычоў** і сакратар ЦК КП(б)Б т. **Жэброўскі.** Прамова тав. **Жэброўскага** неаднаразова перапынялася гучнымі апладысментамі. З вялікай увагай злёт выслухаў прамову сакратара Заходняя-абласнога камітэта комсамола тав. **Колычава.**

Прадстаўнікі ад пролетарыята Баўманскага раёна (Масква), а таксама прадстаўнікі ад Чырвонага крыжа т. **Найда,** Аўтадора т. **Корш** паставілі перад злётам рад канкрэтных задач па ўзмацненню абароназдольнасці краіны. Ударнікі абароннай работы т. **Чэрняк** (ад Гомсельмаша), **Рутэнберг** (ад Віцебскай швейнай фабрыкі), **Зорын** (ад завода «Чырвоны металіст») і інш. падзяліліся вопытам сваёй работы на абаронным фронце.

Усе выступаючыя ўдарнікі, дзелячыся вопытам работы, у той-жа час падкрэслівалі, што абаронная работа на мясцах яшчэ не стала ў цэнтры ўвагі комсамола, што яна часамі яшчэ знаходзіцца на задворках.

Бурай апладысментаў і крыкамі «ура», «Няхай жыве Рэвваенсовет», «Няхай жыве т. **Сталін**», «Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з т. **Гікало**»—спаткаў злёт прывітальныя тэлеграмы **т. ВАРАШЫЛАВА і ЦК КП(б)Б.**

Для прывітання злёта ад ударнікаў літаратурнага фронта з'явіліся рускія, беларускія і ўкраінскія пісьменнікі т. т. **Агнёў, Вашэнцаў, Маркіш, Дуброўскі, Леўман, Харык, Мурашка, Александровіч і Броўка.**

Тав. **Александровіч** перадаў прывітанне ад аргкамітэта Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі, а тав. **Агнёў** ад усесаюзнага арганізацыйнага камітэта саюза совецкіх пісьменнікаў. Прывітанні пісьменнікаў былі спатканы бурнымі апладысментамі.

З вялікай увагай злёт выслухаў зачытаны т. **Агнёвым** яго расказ «Первое дневальство», які паказвае жыццё салдата ў царскай арміі. Тав. **Броўка** зачытаў урывак з паэмы **«Минеральныя веды»,** тав. **Харык** — урывак з паэмы «Аўрал» і т. Маркіш—верш. Адказам на зачытаныя пісьменнікамі творы былі гучныя і працяжныя апладысменты з крыкамі «Няхай жыве і мацнее пролетарская літаратура ра ўсім свеце, няхай шырыцца і мацнее сушрацоўніцтва ўдарнікаў літаратуры і ўдарнікаў абароны».

КАШТОЎНЫ ПАЧЫН

Пытанне аб таварнай змычцы горада з калгасным сялянствам на ўвае зараз важнейшае значэнне. Калгаснікі — ўступілі на шлях кожнасці. Нямала калгасаў, і ў вышыню ўпартай ударнай працы на соцыялістычных палях забяспечана размеркаванне 0 клг. збожжавых культур і 12-клг. бульбы на працадзень, г. што лепшыя перадавыя ўдарнікі атрымаюць пры размеркаванні ўраджаю вялікую колькасць прадукцыі.

Калгаснае сялянства імкнецца лепшыць сваё жыццё, зрабіць культурным. Яно імкнецца рэалізаваць плады ўдарнай працы, ды соцыялістычных адносін да гаснай вытворчасці.

Гэта патрабуе лепшай арганізацыі снабжэння, яшчэ большага ўлення таваразварота паміж ам і вёскай, патрабуе, каб таўная прамысловасць праз вую сістэму кераківула на значна больш тавараў высокасці.

Вось чаму вялізарную ролю адыграе разгортванне культурнага цкага гандлю. Нічога не варта

тая каапераціўная арганізацыя, якая не зразумела вялізарных зрухаў, што адбыліся ў вёсцы не навучылася працаваць па-новаму.

У гэтых адносінах заслугоўвае асаблівай увагі ініцыятыва **палітаддзела Капыльскай МТС і райспажыўсаюза.**

Яны заключылі паміж сабой соцыялістычны дагавор на лепшае абслугоўванне калгаснікаў.

Спажывецкая кааперацыя Капыльшчыны абавязуецца забяспечыць завоз тавараў, неабходных для гаспадарчых і культурных патрэб калгаснікаў, ажыццяўляць практыку індывідуальных заказаў.

Тавараснабжэнне будуецца на аснове пераважнага снабжэння ўдарных звеншаў, брыгад і перадавых калгасаў.

У сваю чаргу палітаддзел МТС дапамагае каапераціі ў арганізацыі актыва, у мабілізацыі паёў, у скарыстанні калгаснага транспарта для перавозак тавараў, у ачыстцы гандлёвых кадраў ад чужых элементаў.

Гэты першы дагавор хварэе яшчэ некаторай агульнасцю. Мала ў ім канкрэтных абавязацельстваў. Пры заключэнні далейшых дагавораў гэта трэба абавязкова ўлічыць.

Райспажыўсаюз павінен асабліва сур'ёзна заняцца вывучэннем опыта калгаснікаў, каб на гэтай аснове будаваць план завоза тавараў.

Калі гэта будзе зроблена, калі кааперація дабіцца забеспячэння рэна патрэбным калгаснику асартыментам тавараў, тады спажывецкія таварыствы не будуць ведаць затаварвання, план таваразварота будзе сістэматычна выконвацца, яшчэ больш узрасце попыт калгасных мас.

Лепельская база, якая дакладна вывучала попыт калгаснікаў, сабрала заявак на тавары на 300 тыс. руб. Гэтыя заўкі леглі ў аснову ўсёй гандлёвай работы базы. Прыкладу апошняй павінны следаваць усе арганізацыі.

Першы дагавор, заключаны паміж палітаддзелам і райсаюзам, не павінен застацца голай дэкларацыяй. Ён павінен з'явіцца баявой праграмай барацьбы за далейшае ўзмацненне таварнай змычкі паміж горадам і калгаснай вёскай.

Насустрач узросшым патрабаванням калгаснікаў

Соцдагавор паміж палітаддзелам Капыльскай МТС і райспажыўсаюзам

Для задавальнення ўзросшых культурна-бытавых патрабаванняў калгасных мас, РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ АБАВЯЗВАЕЦЦА:

— У 15-дзённы тэрмін правесці культурны выгляд усе крамы, пар абслугоўваючыя калгасы зоны С.

— Забяспечыць завоз тавараў, неабх як для гаспадарчых, так і ных патрэб калгаснікаў, шы гарнуць практыку індывід заказаў.

— Задавальнення патрабаван н-калгаснік, арганізаваць ие «куток матмлада», нцэнтраваны патрэб вары.

— партыйна-комса праўленням кап льсоветаў, у ар кутковаў, хат-чы іх мэбляю, лам трэтамі, шашкамі, ратурай і інш.

— нічаць калгасам у арга цырулькяў і пазняў, забяс ць іх неабходнымі інструман і інвентаром.

— Арганізаваць ва ўсіх крамах гандаль гаспадарчымі тавара (лампы, гадзіннікі, самавары, мусы, шпалера, крэйда для па і інш.).

— Пры завозе тавараў абавязкова ваць пераважнае снабжэнне ных калгасаў, брыгад і звен

— Дапамагчы абсталяванню лен а МТС мэбляю, радыё-апарату шашкамі, шахматамі, літарату

— Забяспечыць сталоўку МТС аляваннем і інвентаром.

— Палепшыць работу ларка, аб ўваючага работнікаў МТС, пе ўшы лепшыя тавары для забес ння «паліц ударніка».

ЛІТАДДЗЕЛ МТС узяў на ся бе наступныя абавязацельствы:

— Дапамагчы спажыўтаварыствам у перабудове іх работы, прыцягнуўшы да гэтага партыйныя ячэйкі, комсамольцаў, калгасны актыў.

— Дапамагчы райспажыўсаюзу ў выкананні плана паянакапленняў і загатовак усіх відаў.

— Прыцягнуць да работы каапераціі калгасную грамадскасць пад лозунгам: «Лепшы ўдарнік-калгаснік — лепшы пайшчык спажывецкай каапераціі».

— Дапамагчы райсаюзу і ССТ у падрыхтоўцы кадраў, вылучыўшы на работу ў каапераціі лепшых кадраў гаснікаў-ударнікаў.

— Арганізаваць заключэнне дагавораў паміж калгасамі і спажыўтаварыствамі аб скарыстанні калгаснага транспарта для перавозкі тавараў.

— Садзейнічаць сельспажыўтаварыствам у праверцы і ачыстцы апарата ад нягодных і чужых элементаў.

Нач. палітаддзела Капыльскай МТС МАІСЕЕЎ.

Старшыня праўлення Капыльскага райсаюза РУБЕН.



Укатка [illegible]ванай шасейнай дарогі.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ ПАД ПЯЧАТКАЙ

У адным з незлічоных дэпартаментаў расійскай імперыі часоў Александра I служыў сапраўдны статскі саветнік Іван Маркоў. Апрача «верай і праўдай» заслужаных ордэнаў, асабняка і падагры, гэты чыноўны муж меў нахіл да творчасці. Ён абяссмерціў сваё імя вялізарнейшай працай, на 15 тамоў, пад назвай «Всеобщий стряпчий».

Іван Маркоў з усёй пераканальнасцю «высокага штыля» даводзіў вагу і выключнае значэнне духа сургуча, духа казённай пячаткі ў справе арганізацыі грамадскага парадка:

«Дабы составные документы, имеющие на своем лбу титул казенного ведомства или торговых рядов, могли толкать людей на соображения делового свойства, дух сургучной печати всегда должен вселять в них неослабную, вызывающую соображения силу, подобно тому, как молоко неболящей матери вселяет в дитя неослабное здоровье».

Зусім зразумела, што 16 год Кастрычніка, пахаваўшы чыноўніцтва, як упрывілеяваны стан, сістэматычна і няўхільна выпальваюць дух казённай пячаткі—сімвал бяз душнасці, цеганіны і абураючага бюракратызма. Але нельга сказаць, каб гэты ўцелёны і суровы дух капчаткова знік у нашых установах... У прыватнасці, ім асабліва грэшна яшчэ сістэма органаў сувязі—ад ЦП саюза да нізавога паштова-тэлеграфнага пункта.

У праверцы ажыццяўлення дырэктыў партыі па нацпытанню, у працэсе азнаямлення з тым, як на справе, штодня ідзе ва ўстановах сувязі барацьба за ленінскую нацыянальную палітыку, нам прышлося зноў адчуць непераможны дух сургуча!

...Адказны сакратар **ЦП саюза сувязі** Беларусі т. **Рубінчык** на скромнае запытанне: «ці спрацоўваліся ў нізавых звеннях саюза, на агульных сходах работнікаў, пастановы сакавіцкага пленума ЦК КП(б)Б»—паўтарыў некалькі пакрыўджана пацісканае плячыма:

— А як-жа вы думалі? Бясспрэчна распрацавалі... Давялі, можна сказаць, да кожнага!.. Усе ведаюць пастановы па нацпытанні! І кра лст т. т. Гікало і Галадзеда ў «Праўду» ведаюць. Даўно гэта было, але давялі, кажу, яшчэ тады!

Невядома як, паводле т. Рубінчыка, «давялі» і распрацавалі на мясцах зусім дакладныя і выразныя рашэнні нашай партыі па нацпытанню, але можна напомніць яму некалькі характэрных фактаў, якія былі выкрыты неўзабаве-жпасля пленума ЦК.

Загадчык **віцебскай** канторы сувязі **Анімаў** доўгі час праводзіў у сваёй установе беларусізацыю выключна загадамі, без ніякай растлумачальна-масавай работы, «змагаючыся» з тымі, што яшчэ не паспелі аўладаць беларускай мовай, сцісла і проста:

— Каб у тры дні вашага духу тут не было!

Працаўнік **гомельскай** канторы сувязі **Сліж** збіў яўрэя-кіоскера за тое, што той адважыўся ўзяць з печкі ў яго пакоі гаршок гарачага вугалю.

Пры гэтым Сліж аблаяў кіоскера антысеміцкімі выразамі і дадаў —Можаш са сваімі газетамі і ў холадзе пасядзець. Невялікі пан!

Ва **Ўшачах** работнікі сувязі **Дзядзкоў і Васільеў** забаранілі тэлеграфістцы гаварыць з наведвальнікамі на іх роднай мове, у прыватнасці, па-яўрэйску.

— Эй, туш,—звярнуўся адной чы да яе Дзядзкоў,—аддай назад гэту жыдоўскую тэлеграму... Мы не разумеем!

У **Негарэлым** работнікі сувязі **Маляўка, Калапонка, Міркач** на глебе самага непрыкрытага антысемітызма настоялі на выключэнні з калгаса нядаўна ўступіўшай туды бядняцкай Гласман. Старшыня рабочкома **Маляўка** паўтарыў і на агульным сходзе супрацоўнікаў абараняў сваю пазіцыю, спасылаючыся:

— Ну, ясная справа, ёй у **нашым** калгасе не месца!

У **Дрыссе** супрацоўніца газетна-паштовай канторы **Сіроцінская** жаманна, але непахісна і вельмі недвузначна абвясціла:

— Я гэту яўрэйскую газету «Акцябр» не люблю—таму і падпіску на яе не прымаю! Чытайце нашы газеты, рускія (!).

Дух сургуча — казённы, абыватальскі! нацыход да актуальнейшай палітычнай справы не даў магчымасці ЦП саюза сувязі Беларусі адчаўведным чынам распаяць гэтыя факты і па-большавіцку рэагаваць на іх, мабілізуючы масы вакол задач інтэрнацыянальнага пролетарскага выхавання. У сухім і абыякавым пратаколе (пратаколаў у ЦП саюза сувязі—безліч!) пасля памяпёных выпадкаў занатавана: «У некаторых прафарганізацыях недастаткова правядзена палітычна-выхаўчая работа і інтэрнацыянальнае выхаванне». І—кропка! Больш як на канстатацыю фактаў ЦП не «рызыкнуў» пайсці.

Беларусізацыя па лініі ЦП саюза сувязі праводзіцца зноў такі фармальна, па-казённаму. Пастанова СНК БССР пра змены і спрашчэнне беларускага правапіса адгукнулася толькі далёкім рэхам як у апараце ЦП, так і на перыферыі, у нізавых прафарганізацыях саюза сувязі. Гурткоў па вывучэнню асноўных правіл новага правапіса няма і ў паміне...

З беларусізацыяй, магутнейшай зброяй у змаганні як з вялікадзяржаўным шавінізмам, так і з контрреволюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, нікольні не лепш і ў **Беларускім кіраўніцтве сувязі.** Там людзі разважаюць шчыра і адкрыта:

— Мы—апарат кіраўнічы, маем сувязь непасрэдна з Масквой: нам беларусізавацца не так ужо і важна... Як-небудзь і так пражывем!

Пры гэтым, аднак, калі адкінуць спасылку на «непасрэдную сувязь з Масквой», дык і ўнутры самога кіраўніцтва, і ў перапісцы яго з аддзяленнямі на БССР, беларуская мова не ў пашане...

Парт'ятэйка кіраўніцтва сувязі ў асобе сакратара т. **Пісарчыка** не стала на чале ажыццяўлення ў ім ленінскай нацпалітыкі, не стала на чале беларусізацыі апарата. Паказальна, што пытанне адносна спрашчэння беларускага правапіса было толькі праз некалькі тыдняў пасля апублікавання яго пастаўлена на агульным сходзе ў бягучых справах. Тады-ж ухвалілі стварыць асцяведны гурток, але... машыністка не справілася перадрукаваць пратакол схода і гуртка няма па сёнешні дзень! Відаць, і тут яшчэ не зжыт славуты дух сургуча...

Рэкорд нацбайнасці і цаўнейшага самацёка ў гэтай справе пабіт, **Менскай канторай сувязі.** Кіраўнікі Менскай канторы сувязі, калі вы пачынаеце гаварыць з імі наколт правядзення нацпалітыкі, у прыватнасці беларусізацыі, наогул, саромліва адводзяць вочы ў бок і імкнуцца перавесці хутарку на больш бязвінныя тэмы. Калі-ж пытанне ставіцца канкрэтна і «ратушку» няма, пачынаецца ветлівае кізанне Івана на Пятра і наадварот. Усе аказваюцца новымі людзьмі, гэтай справай яшчэ «не паспелі заняцца».

Сакратар парткалектыва сувязі т. **Хацілоўскі** рашча гаварыць па гэтаму поваду з сакратарамі цэхавых ячэек («яны больш у курсе справы»)—т. т. **Чаркасавым, Ханекесам, Кудлачом;** сакратары цэхавых ячэек у сваю чаргу сцвярджаюць, што апрача загадчыка эксплуатацыйнай часткі тав. **Клімковіча** паўрад ці зможа хто-небудзь расказаць лепей!

Як-жа ішла ў канторы прапрацоўка кастаноў сакавіцкага пленума ЦК і як зараз гэта прапрацоўка адлюстроўваецца на практыцы? На гэта адказваюць таксама факты.

Старшыня рабочкома **Сушко** трымаецца такой думкі:

— Цяпер такая ўстаноўка: гавары і пішы на любой мове!

На такую няправільную «ўстаноўку» Сушко, якая захавана накіравана да зрыва беларусізацыі, прабуюць браць раўнення іншыя. І сёння на пошце вы, як правіла, не пачуеце ад супрацоўніка адказа на беларускай мове... Насцепгазета **«За большэвіцкую сувязь»** за ўвесь час не змясціла ніводнага артыкула па беларусізацыі і нацпалітыцы наогул.

Няведанне і нежаданне ведаць беларускай мовы паасобнымі работнікамі тэлеграфа прыводзіць да скажэння сэнса тэлеграм. Зусім ня даўна, напрыклад, у тэлеграме Бел ільнатрактарацэнтра замест **«сёння** тэлеграфце фактычна зароблену колькасць натурплаты» перадалі ў Чавусы: **«семя** тэлеграфце...» і г. д. Мястэчка Сосны «перакладаецца» тэлеграфісткай, як «Сасноў». Такія памылкі, як «Новыя дзелянкі» замест «Новыя Дземяхі», як «укамплектаванне пленумаў», замест «укамплектаван не лагераў», як **«Краснагор'е»,** замест **«Краснаполле»,** таксама тлумачацца ў значнай меры слабым веданнем беларускай мовы.

Становішча з беларусізацыяй па сістэме сувязі БССР, у прыватнасці Менска, патрабуе карэннага пералома. Трэба пакончыць з казённым, бюракратычным падыходам да гэтай адказнейшай справы! Трэба рашуча зрываць маскі з тых, хто за фактычным ігнараваннем беларусізацыі, за антысавецкімі спробамі распэньваць спрашчэнне беларускага правапіса, як крок да «русіфікацыі», хавае свой класава-варожы твар раз'юшанага вялікадзяржаўнага шавініста.

ЮР. ЛЯВОННЫ.

ЛЕЙПЦЫГСКІ СУДОВЫ ФАРС

ТРЫБУН КЛАСАВАЙ ПРАУДЫ

ДЗІМІТРАЎ ВЫКРЫВАЕ ОБЕР-АХРАННІКАЎ

ЛЕЙПЦЫГ, 29 лістапада (БЕЛТА).

Сёння на працэсе аб падпале рэйхстага разбіраецца комплекс пытанняў, звязаных з учарашнім допытам паліцэйскіх.

Дусельдорфскі паліцэйскі камісар не прывёў ні адпаго дакумента, ні адпаго факта, якія даказвалі-б асноўны тэзіс абвінавачвання, а іменна, што германская компартыя «назначыла на канец лютага ўзброенае паўстанне» і што «падпал рэйхстага быў сігналам да гэтага паўстання».

Дзімітраў і Торглер па-ранейшаму атакуюць сведак пытаннямі пры поўным бязмоўі абароны.

Усе пытанні Дзімітрава накіраваны на тое, каб высветліць палітычную абстаноўку, якая была перад падпалам рэйхстага. У адной з зачытаных паліцэйскім адозваў ком партыі проста гаворыцца, што «рэвалюцыйнай абстаноўкі няма».

Паліцэйскі «сведка» сцвярджае, быццам у Дусельдорфе выяўлена «калона атрутчыкаў, якая ставіла сваёй мэтай атручванне штурмавікоў» і быццам «выяўлена атрута якой можна было-б атруціць 18 тыс. чалавек» і г. д. Затым ён гаворыць, што компартыя прабавала выклікаць хваляванні сярод членаў Рэйхсбанера («Саюза рэспубліканскага флага») і ў радах соцыял-дэмакратыі.

«Адбылося нелегальнае пасяджэнне,—заяўляе ён,—на якім было пастаноўлена забіць сакратара соцыял-дэмакратычнай арганізацыі і віну ўскласці на нацыянал-соцыялістаў. Там-жа было пастаноўлена забіць некалькі чыноўнікаў палітычнай паліцыі».

Аднак, тут-жа «сведка» прызнае, што суд, які разбіраў гэту справу, вымушан быў апраўдаць падсудных з прычыны недаказанасці абвінавачання.

У сувязі з учарашнімі паказаннямі гэтага «сведкі» аб партыйнай канферэнцыі ў Дусельдорфе, на якой нібыта распаўсюджваўся план горада з абазначэннем прадпрыемстваў, чыгуначных вузлоў, паліцэйскіх казарм і г. д., Торглер адзначае, што гэта канферэнцыя была легальнай канферэнцыяй революцыйнай прафапазіцыі і па ёй ніякія планы не распаўсюджваліся.

Дзімітраў патрабуе дакладнага расследавання з мэтай высветліць, якія планы былі знойдзены ў Рурскай вобласці з абазначэннем размяшчэння паліцэйскіх казарм, важнейшых прадпрыемстваў і г. д.

Ён пры гэтым гаворыць, што абазначэнне прадпрыемстваў, чыгуначных майстэрань, чыгуначных вузлоў і г. д. з'яўлялася, можа быць, звычайным метадам работы прафапазіцыі для арганізацыі эканамічнай барацьбы на гэтых пунктах.

Дзімітраў пытаецца:

«Ці разумее сведка заклік да ўзброенага паўстання ўжо ў тым, што комуністычныя адозвы канчаюцца лозунгамі: «Няхай жыве совецкая Германія», або: «Наперад да рэвалюцыйнай барацьбы пролетарыята»?

Старшыня адхіляе гэта пытанне.

Дзімітраў патрабуе дакладнага расследвання, ці сапраўды ў комуністаў у Дусельдорфе была знойдзена атрута, прызначаная для атручання 18 тыс. палітычных праціўнікаў.

Старшыня ўказвае, што па гэтай справе вядзецца следства, што суд азнаёміцца з актамі гэтага следства.

Дзімітраў: «Людзі са здаровым розумам не могуць верыць таму, што германскія комуністы хацелі атручваць штурмавікоў — гэта ідыётства».

Зварачаючыся да ўсіх паліцэйскіх чыноўнікаў, даваўшых паказанні, Дзімітраў пытаецца: «У якой меры былі напружаны палітычныя адносіны ў той перыяд паміж нацыянал-соцыялістамі—з аднаго боку і «Сталёвым шлемам» і іншымі нацыяналістамі арганізацыямі—з другога?

Якія распараджэнні былі выданы цэнтральнаю ўладаю напярэдадні падпала рэйхстага ў сувязі з чаканым узброеным паўстаннем і якія канкрэтныя адзнакі гаварылі аб тым, што сапраўды мае быць узброенае паўстанне? Ці рабіліся паліцыяй альбо нацыянал-соцыялістамі пасля падпала рэйхстага арышты комуністаў?

Ці не маглі гэтыя арышты комуністаў нацыянал-соцыялістамі, а не паліцыяй, аказаць правакацыйнае дзеянне?»

Усе гэтыя чатыры пытанні старшыня адхіляе.

Пятае пытанне Дзімітрава: «Граф Гельдорф заявіў на судзе, што падставай для арыштаў комуністаў было тое, што ён разглядваў марксістаў, як злачынцаў. Якія канкрэтныя падставы крыводзіліся пры арышце комуністаў у гарадах?»

Шостае пытанне: «Ці верна тое, што пры тагачасных абставінах падпал рэйхстага быў сігналам да нападу супроць рабочага руху, быў скарыстаны для перамагання ўнутраных гвалтоссяў, і трудпасцяй унутры нацыянальнай каліцыі і для ажыццяўлення нацыянал-соцыялістскіх прынцыпаў адзінаўладзя і ўніфікацыі?»

Дзімітраў указвае, што адказы на гэтыя пытанні маюць вялізарнае значэнне для высвятлення палітычнай абстаноўкі ў той перыяд.

Ён гаворыць:

«Комуністычная партыя Германіі змагалася за совецкую Германію, яна зараз за гэта змагаецца. Яна змагалася і змагаецца супроць капіталістычнага лада. Яна мобілізавала масы на барацьбу супроць фашызма і павінна была дзейнічаць так»...

Старшыня рэзка спыняе Дзімітрава, забараняючы весці комуністычную прапаганду ў зале суда.

Суд аб'яўляе перапынак для рашэння, ці падлягаюць пытанні Дзімітрава судоваму разбору. Пастаноўлена: большасць пытанняў Дзімітрава адхіліць. Пакідаюцца толькі 3 пытанні, якія могуць быць заданы паліцэйскім чыноўнікам, выступаючым у якасці сведак.

СКЛІКАННЕ ГЕРМАНСКАГА РЭЙХСТАГА

БЕРЛІН, 29 лістапада. (БЕЛТА). Старшыня рэйхстага Герынг пастанавіў склікаць рэйхстаг 12 снежня.

У МЕНСКУ АДКРЫЎСЯ ДОМ МАСТАКА

29-га лістапада ў Менску адбылося адкрыццё Дома мастака—цэнтра грамадскай і вытворчай дзейнасці совецкіх мастакоў.

***

Дом на Комуністычнай, дзе арганізован цяпер добры, культурны прытулак нашым мастакам, да дня адкрыцця аздобіўся спецыяльнай выстаўкай лепшых карцін і скульптурных работ мастакоў БССР, а таксама рэпрадукцыямі карцін старых рускіх майстроў.

А 9-й гадзіне ўвечары старшыня Галоўмастацтва БССР тав. **Х. Дунец** адкрыў урачысты сход, прысвечаны гэтай падзеі ў нашым культурным будаўніцтве.

Шумнымі воплескамі сустракае зала прапанову ўвесці ў прэзідыум прадстаўнікоў делегацыі аргкамітэта Саюза совецкіх пісьменнікаў РСФСР т. т. **Б. Ясенскага, Вл. Бахметьева, Вл. Лідзіна** і **С. Бройдз.**

У ганаровы прэзідыум выбіраецца **палітбюро ЦК УсеКП(б)** на чале з **І. В. Сталіным** і т. т. **Гікало, Галадзед, Чарвякоў.**

Пасля невялікага ўступнага слова т. Дунец зачытвае загад Наркам асветы пра адкрыццё Дома, у якім указваецца назваць яго **Домам мастака імя 16-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі.**

З прывітальнымі прамовамі выступілі: ад ЦК КП(б)Б—загадчык культпропа ЦК тав. **Тамаркін,** ад СНК БССР—тав. **Галадзед,** ад прэзідыума Беларускай Акадэміі навук—тав. **Домбаль,** ад аргкамітэта ССП і МОРП—т. **Бруно Ясенскі,** ад аргкамітэта ССПБ — т. **Я. Бранштэйн** і інш.

Усе прамоўцы падкрэслівалі, што самы факт стварэння Дома з'яўляецца лішнім доказам правільнасці няўхільнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах БССР. Дом мастака павінен з'явіцца асяродкам, у якім нашы мастакі з яшчэ большай інтэнсіўнасцю і поспехам разгорнуць сваю творчую работу, а таксама работу па выяўленню і дапамозе новым кадрам.

Сход паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б)—тав. **Сталіну,** ЦК КП(б)Б—тав. **Гікало** і СНК БССР—тав. **Галадзеду.**

Вечар прайшоў з надзвычайным уздымам. Мастакі, якія ў сваіх прамовах адказвалі на прывітанні, абяцалі прыкласці ўсе свае сілы па паспяховае ажыццяўленне задач, пастаўленых перад імі партыяй і ўсёй совецкай грамадскасцю, задач па стварэнню мастацтва, вартага нашай вялікай эпохі будаўніцтва бяскласавага грамадства.

Юр.

На новай совецкай ратацыі пачынае друкавацца „Звязда“



З СЕНЕШНЯГА ДНЯ «ЗВЯЗДА» ДРУКУЕЦЦА НА НОВАЙ РАТАЦЫІ, ЗРОБЛЕНАЙ НА НАШЫМ СОВЕЦКІМ ЗАВОДЗЕ, З НАШЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ, НАШЫМІ РАБОЧЫМІ, ПА КАНСТРУКЦЫІ СОВЕЦКІХ ІНЖЫНЕРАЎ.

ДА ГЭТАГА ЧАСУ «ЗВЯЗДА» ДРУКАВАЛАСЯ НА РАТАЦЫІ ГЕРМАНСКАЙ ФІРМЫ І МЕЛА МАГУТНАСЦЬ 12 ТЫС. АДБІТКАЎ.

НОВАЯ СОВЕЦКАЯ РАТАЦЫЯ, ЗРОБЛЕНАЯ НА РЫБІНСКІМ ЗАВОДЗЕ ІМЯ т. ЯГОДЫ, МАЕ МАГУТНАСЦЬ 36 ТЫС. АДБІТКАЎ У ГАДЗІНУ.

ФАШЫСЦКАЕ АБВІНАВАЧАННЕ ЦЕРПІЦЬ ПРАВАЛ ЗА ПРАВАЛАМ

ЛЕЙПЦЫГ, 30 лістапада (БЕЛТА).

Суд дазволіў паставіць сведкам толькі наступныя пытанні:

Якія меры былі прыняты цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі ў сувязі з чаканым узброеным паўстаннем напярэдадні падпала рэйхстага?

Калі пасля падпала рэйхстага былі зроблены арышты комуністаў?

На якіх падставах арышты комуністаў праводзіліся ў розных акругах?

Услед за гэтым па аднаму дапытваюцца паліцэйскія чыноўнікі, якім прапануецца даваць адказы на гэтыя пытанні.

Першым дапытваецца Геллер. Ён заяўляе, што насупраць з прыходам да ўлады нацыянал-соцыялістаў была ўзмоцнена барацьба супроць комуністаў.

«На падставе майго шматгадовага вопыта, — гаворыць Геллер, — я магу сцвярджаць, што прычынай палітычных сутычак у розных мясцах заўсёды былі комуністы».

Торглер: «Калі Геллер на падставе сваёй шматгадовай дзейнасці заключае, што ў сутычках заўсёды былі вінаваты комуністы, дык я павінен сказаць, што ранейшы міністр унутраных спраў і паліцэй-прэзідэнт не раз заяўлялі ў рэйхстагу, ландтагу і іншых органах, прад'яўляючы матэрыялы і дакументы, дзе ўказвалася якраз процілеглае таму, што сцвярджае Геллер.

Яны заяўлялі, што ўвесь прыводзімы імі матэрыял атрыман ад палітычнай паліцыі. Гэты матэрыял прадстаўлен у прыватнасці ў ліпені 1932 г. Як відаць ён выходзіў ад самога Геллера».

Геллер адказвае, што «тады панавала думка, што повад да ўзброеных сутычак давалі ўсюды комуністы».

Торглер: «Такім чынам, тут дасцца аднабакова малюнак падзей, які не супадае з паведамленнямі міністраў унутраных спраў напярэдніх урадаў. Іх паведамленні грунтаваліся на паліцэйскіх матэрыялах, і тады яны расцэньваліся інакш і сам Геллер расцэньваў тады, мабыць, таксама інакш».

Старшыня рэзка спыняе Торглера, заяўляючы, што ён «не пацерпіць такіх нападак абвінавачаных на паліцэйскага чыноўніка».

Затым Геллер рысуе абстаноўку, у якой адбываліся арышты комуністычных дзеячоў у ноч пажара. Ён сцвярджае, што распараджэнне аб арышце ўсіх кіруючых комуністычных дзеячоў было дано ў ноч пажара па рашэнню кабінета. Мэта гэтай меры заключалася ў тым, каб пазбавіць компартыю правадыроў і паралізаваць усякую магчымасць выступлення.

Паліцэйскі чыноўнік з Гамбурга гаворыць:

«Паліцыя не ведала, што павінна было адбыцца. Аб узброеным паўстанні тады не гаварылася. Але паліцыя рыхтавалася да сур'ёзных падзей. Напярэдадні пажара былі арыштаваны актывісты компартыі».

Паліцэйскі з Кенігсберга заявіў, што арышты адбыліся 3-га сакавіка, каб перашкодзіць дэманстрацыям і выступленням.

Паліцэйскі чыноўнік з акругі Грэнцмарк таксама паказвае, што да пажара былі арыштаваны некалькі комуністычных актывістаў, «каб папярэдзіць арыў нацыяналістскіх дэманстрацый».

Праз некалькі дзён пасля пажара былі праведзены новыя арышты. Паліцэйскі чыноўнік з Альтоны гаворыць, што арышты былі там зроблены 4-га сакавіка.

ДЗІМІТРАЎ заяўляе:

«Мае пытанні мелі вялікае значэнне. Гельдорф на судзе сцвярджаў, што паўстанне не адбылося таму, што былі арыштаваны актывісты компартыі. Аднак, паказанні сведак гавораць аб тым, што арышты рабіліся на тых падставах, што была «небяспека дэманстрацый» і г. д. У некаторых мясцах арышты праведзены 3-4 сакавіка. Вось чаму я сцвярджаю, што ўрадавыя органы ў Берліне і ў правінцыі не чакалі 27-га лютага ніякага ўзброенага паўстання і таму не далі ніякіх распараджэнняў для барацьбы супроць яго. Я патрабую, каб прад'явілі хоць адзін аўтэнтычны дакумант, які эмацнуў-бы распараджэнне аб прыняцці ўладамі мер супроць паўстання».

У сувязі з гэтым прама пастаўленым патрабаваннем Дзімітрава пракурор спасылаецца на тое, што 2-га сакавіка выдан закон аб узмацненні мер пакарання за дзяржаўную здраду, аб увядзенні кары смерцю, меры, якія на яго думку пацвярджаюць, што кіруючыя колы разумелі тады актуальную небяспеку.

Далей суд дапытвае Геллера, ці добраахвотна з'явіўся Торглер у паліцыю.

Справа ў тым, што Торглер, які з'явіўся ў паліцыю, быў накіраван іменна да Геллера. Згодна патрабавання Торглера зачытваецца пратакол першага допыта Торглера, у якім гаворыцца:

«Добраахвотна з'яўляецца Торглер і дае тлумачэнні ў сувязі з заметкай, якая з'явілася ў прэсе...»

Тады вярхоўны пракурор хоча высветліць ці не былі прыняты меры, перашкодзіўшыя Торглеру, які знаходзіўся пад пагрозай арышта, выехаць за граніцу, так, што ён вымушан быў з'явіцца ў паліцыю.

На гэта Торглер адказвае, што ён, само-сабой разумеецца, зусім не думаў аб выездзе за граніцу. Апроч таго, гэта было-б не так трудна, бо рад комуністычных дзеячоў перайшоў праніцу ў той перыяд.

«Калі ім гэта ўдалося,—гаворыць Торглер,—дык нашэўна ўдалося-б і мне. Я з'явіўся ў паліцыю таму, што мяне і маю партыю паставілі ў сувязь з гэтым бяглузным падпалам рэйхстага».

Дзімітраў прапануе выклікаць у якасці сведкі таварыша старшыні «Сталёвага шлема» Дэюстэрберга.

«Дэюстэрберг павінен быць дапытан, — заяўляе Дзімітраў, — па наступных пытаннях:

1) Ці верна, што адносіны паміж нацыянал-соцыялістскім кіраўніцтвам і «Сталёвым шлемам» у студзені — лютым былі настолькі напружаны, што ў наяўнасці была небяспека ўзброенай сутычкі?

2) Ці верна, што пасля 30-га студзеня гэтыя супярэчнасці яшчэ засталіся і прывялі да многіх сутычак паміж нацыянал-соцыялістамі і «Сталёвым шлемам».

3) Ці верна, што рад арганізацый «Сталёвага шлема» ўстанавіў сувязь з Рэйхсбанерам, каб арганізаваць адзіны фронт супроць нацыянал-соцыялістскай небяспекі?

4) Ці верна, што па гэтаму повяду ў радах «Сталёвага шлема» былі вялікія разгалоссі?

5) Ці верна, што падпал рэйхстага быў скарыстаны, як сродак адцягнення ад унутранай барацьбы ў нацыянальным лагеры?

Тут вярхоўны пракурор выступае з прамовай, у якой матывуе неабходнасць паклікаць прапанову Дзімітрава аб выкліканні Дэюстэрберга, бо лічыць, што пытанне аб супярэчнасцях паміж «Сталёвым шлемам» і нацыянал-соцыялістскімі арганізацыямі не мае ніякага значэння.

Дзімітраў: «Калі разглядаць справу чыста тэарэтычна, можна згадзіцца з вярхоўным пракурорам, але мы маем палітычны працэс, ён можа прывесці да правільнага рашэння толькі тады, калі будзе высветлена сапраўдная палітычная абстаноўка ў той перыяд. Можа быць, хто-небудзь бацца выявятлення гэтых пытанняў? Я не баюся гэтага».

Пракурор заяўляе, што ім кіраваліся дзеславыя меркаванні.

Старшыня рэзка абрывае Дзімітрава, заяўляючы, што яго паводзіны «нечуваны».

Суд пастанаўляе адхіліць прапанову Дзімітрава аб допыце Дэюстэрберга.

Такім чынам, амаль усе прапановы Дзімітрава і пытанні, звязаныя з высвятленнем палітычнай абстаноўкі ў той перыяд судом адхіляюцца.

Пасля гэтага заслухоўваецца 2-гадзінны даклад судовага следчага пры вярхоўным судзе.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРАКУРАТУРЫ РЭСПУБЛІКІ

Органамі расследвання і органамі пракуратуры пры актыўнай дапамозе грамадскасці выкрыт зарэз рад фактаў арганізаванага раскрадвання са складаў збожжа і іншых с.-г. прадуктаў, асноўнымі ўдзельнікамі якога з'яўляюцца кулакі і іншы антыграмадскі элемент.

Так, у БАБРУЙСКІМ раёне органамі пракуратуры і расследвання выяўлена, што работнікі Загатзбожжа сістэматычна займаліся раскрадваннем збожжа, а 11 верасня САСНОЎСКІ і ЖАЎМЕРЧЫК на чале з арганізатарам БАЙРАШАНЫМ укралі са склада СЕМ мяхоў мукі і перадалі суўдзельніку — кулаку ПЯШЧЫНСКАМУ—для рэалізацыі. Выязная сесія Вярхоўнага суда БССР па дэкрэту ўрада ад 7 жніўня 1932 г. аб охове соцыялістычнай уласнасці прыгаварыла: БАЙРАШЫНА і ПЯШЧЫНСКАГА, як арганізатараў сістэматычнага раскрадвання збожжа, да вышэйшай меры соцыяльнай абароны—расстрэла, а ЖАЎМЕРЧЫКА і САСНОЎСКАГА—да 10 год пазбаўлення волі. Прыгавар адносна БАЙРАШЫНА і ПЯШЧЫНСКАГА прыведзен у выкананне.

У ДРЫСЕНСКІМ раёне прапешыя на работу на збожжасклад Загатзбожжа класава-варожыя элементы АЎЗІН і МАЛЕЙ разам з ШЭВЕРНОВІЧАМ і ЖАРНОЎСКІМ сістэматычна раскрадвалі загатоўленае збожжа праз выдачу здатчыкам фіктыўных квітанцый, атрымлівалі ад іх грошы, а частку крадзенага збожжа прадавалі на рынку. Аднаасобнік ЮХНЕВІЧ за грошы атрымаў квітанцыю на нязданыя ў склад 650 кгр. збожжа. Аднаасобнік ГАНЧАРЭНКА за 100 руб. атрымаў квітанцыю на 90 кгр. пшаніцы і г. д.

Выязная сэсія Вярхоўнага суда 1 лістапада 1933 года, на падставе дэкрэта ад 7 жніўня 1932 г. прыгаварыла АЎЗІНА АЛЯКСАНДРА і ЖАРНОЎСКАГА СЫМОНА да вышэйшай меры соцыяльнай абароны—расстрала, МАЛЕЯ, ШЭВЕРНОВІЧА і іншых суўдзельнікаў — да 10 год пазбаўлення волі.

У ВІЦЕБСКІМ раёне вартаўнік арцелі БАРКЕВІЧ з механікам гэтай жа арцелі УШКУРОВЫМ пры дапамозе ФЁДАРАВА і ЖУРАВА прасілі ў склад Загатзбожжа і ўкралі ТЫРЫ мяшкі збожжа. Народны суд Віцебскага раёна на падставе дэкрэта ад 7 жніўня 1932 г. прыгаварыў БАРКЕВІЧА, УШКУРАВА, ФЁДАРАВА і ЖУРАВА да 10 год пазбаўлення волі.

У СМАЛЯВІЦКІМ раёне органамі пракуратуры сумесна з актывам выяўлена кража вагаўшчыком Загатзбожжа ШАРАПАВЫМ 45-ці пудоў збожжа. Нарсуд Смалявіцкага раёна прыгаварыў ШАРАПАВА да 10 год пазбаўлення волі з канфіскацыяй маемасці.

У ДЗЯРЖЫНСКІМ раёне ў результаце злачынна-нядбайных адносін да работы заг. базы Загатзбожжа ШАМБАРЭЦКАГА і прыёмшчыка ВАРЫГОЦКАГА на складах Загатзбожжа збожжа сагравалася, у выніку сапсавана больш 3.000 пудоў збожжа. Нарсуд Дзяржынскага раёна прыгаварыў ШАМБАРЭЦКАГА да 4-х год, ВАРЫГОЦКАГА—да 3 год пазбаўлення волі.

Таксама ўстаноўлена, што на РЫНСКІМ пункце Загатзбожжа тыграмадзкія элементы АРЛОЎКІТА, МАЛОТКА ГАЎРЫЛА і раскралі каля 9.563 кгр. збожжа. Аналагічны выпадак меў месца ПУХАВІЦКІМ раёне.

У метах забеспячэння бязлітаснай барацьбы з ворагамі народа, раскрываючымі соцыялістычную маемасць са складаў і хавальнікаў, прапануем:

1. Пракурорам Полацкага і Пухавіцкага раёнаў забяспечыць тэрміновы разгляд гэтых спраў і аб выніках дапаўсць мне.

2. Усім раённым і гарадскім пракурорам мабілізаваць свой грамадскі актыў і забяспечыць сістэматычны кантроль і праверку аховы складаў і хавальнікаў і пры выяўленні выпадкаў раскрадвання, псавання збожжа і гародніны тэрмінова расследаваць такія справы, прыцягваючы вінаватых да адказнасці.

Пракурор БССР КУЗЬМІН.

УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

Надзежда Осташка. Нарадзілася ў 1913 годзе ў вёсцы ў сям'і бедняка. З раннік год працуе нянькай. Потым вучыцца ў фабзавучы. З 1930 года працуе на віцебскай шэвейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі». Брыгадзір маладзёжнай істужкі імя ЦК ЛКСМВ. Істужка сістэматычна перавыконвае план. Осташка ў камсамоле з 1931 г., член плеўма фабрычнага камітэта комсамола.

Александр Досін. Нарадзіўся ... 1907 г. у сям'і чыгуначніка ... ра. Працуе з 10-гадовага ўзроста ... спачатку ў кулакоў, потым у ... рульні, газетчыкам і, нарэшце, ... нем у дэпо Менск-Заходняя. З 19... года — машыніст. У комсамол ... тупіў у 1924 годзе, у партыі — ... 1929 года. Зараз — партпрымання ... ны да ячэйкі комсамола паравозаў ... каў. Комсамольскі паравоз, кіруе ... Досіным, прымаючы ўдзел у ... конкурсах, атрымаў 3 ганаровы ... граматы.

Паведамленне

2 снежня г. г. а 7 гадзіне вечара ў памяшканні ПК КП(б)Б (пакой № 53) склікаецца нарада парторгаў калгасаў, прымацаваных з горада, па пытанню іх работы ў калгасе.

На нараду выклікаюцца наступныя т. т.

Жук — інст. Совправа, **Паўлаў** — абутковая фабрыка, **Панасюк**—Наркамлегпрам, **Шэўчык**—Наркасулік, **Сапавейчык** — электрастанцыя, **Тыпіндус** — завод «Комунар», **Позняк**—Трампарк, **Барсук** —Белпрамсовет, **Гарэпік**—ЦВК, **Нахмановіч**—... **Рубін** — друкарня імя Сталіна, ... **каваты** — гараж Белсаюзтра... **Алешкевіч** — Белдыпрацыя С... транса, **Казляк** — НКЦяжпрам... **расіменка** — фабрыка «Комуна... **Шаршнёў** — рэдакцыя газеты ... **гаснік Беларусі**, **Аліхіменка**—... **каналтрэст.**

Яўка абавязкова.

Менгарком КП...

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІН...

2-га СНЕЖНЯ а 6-й гадз. увечары, у памяшканні гарсовета (пакой № 32)

АДБУДЗЕЦЦА

З УДЗЕЛАМ АРГ. ІНСТРУКТАРСКАГА АДДЗ. ЦВК БССР І АДДЗЕЛ ЛЕНІНА „ИЗВЕСТИЙ" ЦВК СССР

НАРАДА БЮРО СЕКЦЫЙ

і дэпутацкіх груп Менгарсовета

ПА ПЫТАННЯХ:

1) Ход правядзення вытворчага пахода імя **ГИКАЛО** і ўдзел дэпутацкіх груп у паходзе.

2) Падрыхтоўка да XVII Усесаюзнага з'езда УсеКП(б).

Аргмасавы Аддзел Менгарсовета.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА.

Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор заслуж. артыстрэс публікі тав. **ГІТГАРЦ І. М.**

1 снежня — закрыты паказ для пролетстуда; 2 снежня — адкрыты паказ

ОПЕРА „КАРМЕН" муз. Бізэ.

Пастаноўка **БЕН-НОРДА.** Рэжысер **Ольга Барысовіч.** Пачатак роўна ў 8 гадз. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

(вул. Валодарскага, 7, тэл. № 21-813)

1-га снежня

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі **М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.**

Пачатак у 8 гадз. вечара.

КІНО ПРОЛЕТАРЫЙ — Замежная камедыя ў 7 ч. **ДЗЯЎЧЫНА на ПАБЕГУШКАХ**

КІНО ГУКАВЫ — Гукавы фільм **КАРМЕЛЮК**

КІНО СПАРТАН — Выдатны мастацкі фільм **ДА ЗАУТРА** Драма ў 7 частках. Каса—з 4-х г.

Ад журы па конкурсу на лепшы драматычны твор.

Даводзіцца да ведама зацікаўленых асоб, што апошні тэрмін здачы п'ес — на конкурс **15 снежня** г. г. і што да гэтага тэрміна павінен быць прадстаўлены твор (надрукаваны на машынцы або начыста перапісаны) па адрасу: Менск, Наркамасветы, кіраўніцтва мастацтва, журы конкурса СНК БССР.

Журы конкурса.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Ад 1-га снежня

ВЯЛІКІ МАСТАЦКІ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ

ВЯЛІКАСВЕЦКІ ЗАКЛАД

дзвюма ў 8 частках.

Звыш праграмы кінахроніка Саюзкіно.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

2-га снежня 1933 г. склікае

КАНФЕРЭНЦЫЮ

па арганізацыі і складанню адзінага тэматычнага плана навукова-даследчай работы ў галіне сельскай гаспадаркі на 1934 г.

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1. Тэматычны план навукова-даследчай работы па сельскай гаспадарцы БССР на 1934 г. (дакл. акад. **ДОМБАЛЬ**).

САДАКЛАДЫ:

а) па збожжавых і кармавых культурах (дырэктар збожжавай станцыі тав. **Пранаічук**);

б) севазварот і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне ... (акадэмік **Лублін**);

в) па гародніх культурах і бульбе (нам. дырэктара бульбанай станцыі т. **Кавальчук**);

г) па плодагародніх культурах (дырэктар садова-гароднага ... **ценко**);

д) лён і тэхкультуры (ст. навуковы працаўнік т. **Мяц...**);

е) ахова раслін (праф. **Дарожкін**);

ж) агратэхніка і хімізацыя соцыялістычнага земляробства ... **насьоў**, праф. **Пратасеня**);

з) па аўладанню балотнымі культурамі (нав. прац. ... **Данукін**);

і) па механізацыі (праф. **Вейо**—горацкі ін-т);

к) па жывёлагадоўлі (дац. **Фешчанко**);

л) Сетка навукова-даследчых устаноў у галіне сельскай гаспадаркі (акадэмік **Панкевіч**).

Канферэнцыя адкрываецца ў залі БелАН (Ленінская 29-35, паверх) 2-га снежня, у 12 гадз. дня.

Прэзідыум БелАН.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Дэкаднік цукавых фільм. Толькі чатыры дні: 1—2—3-4 снежня

ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

СНАЙПЕР

У гал. ролях: Салдат—**П. САБАЛЕЎСКІ,** Афіцер—**Б. ШЛІХЦІНГ.**

У праграме—**НОВАЯ САЮЗКІНО-ХРОНІКА № 29.**

Змест: 1) Перад совецка-амерыканскімі перамовамі; 2) Першая ў СССР шахта „Аршам"; 3) Пабудова Уралвальмаша; 4) Новы горад Сталінабад; 5) Гордасць ленінградцаў.

ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ.

ПАЧАТАК а 6, 7,30, 9 і 10,30. КАСА ад 1 гадз. дня.

У ФАЙЭ — АРКЕСТР.

Менск, друкарня «Звязды»

Галоўлітбел № 337